Аддзел па адукацыі Шумілінскага райвыканкама

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
”Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“

# *Беларусь святочная*

Складальнікі:
Бадзешчанкава Валянціна Уладзіміраўна, метадыст
Мураўёва Тамара Мікалаеўна, метадыст
Раманава Святлана Юр’еўна, культарганізатар

Шуміліна, 2021

Рэцэнзент
дырэктар дзяржаўнай установы дадатковай адукацы
”Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“ Н.Л. Пятроўская
Складальнікі:
метадысты Бадзешчанкава В.У., Мураўёва Т.М.,
культарганізатар С.Ю. Раманава

Рэкамендавана
метадычным саветам ДУДА ”Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“
14 студзеня 2021 года, пратакол №4

**Беларусь святочная** / адукацыйны, творчы праект / скл. В.У. Бадзешчанкава, Т.М. Мураўёва, С.Ю. Раманава ; Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі. – Шуміліна, 2021. – 67 с.

У зборніку паказаны вопыт работы Шумілінскага раённага цэнтра дзяцей і моладзі па рэалізацыі адукацыйнага, творчага праекта ”Беларусь святочная“, распрацаваныя ў рамках праекта сцэнарыі свят, майстар-класы, народныя гульні.

Адрасавана педагогам-арганізатарам, педагогам дадатковай адукацыі, наменікам дырэктароў па выхаваўчай рабоце, класным кіраўнікам.

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі ”Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“

**Змест**


| | |
|---|---|
| Уводзіны | 4 |
| Абгрунтаванне праекта | 5 |
| Інфармацыйная карта праекта | 6 |
| Этапы рэалізацыі праекта | 7 |
| План асноўных мерапрыемстваў праекта | 8 |
| Даследчая дзейнасць | 9 |
| Каляды | 11 |
| Гульня ”Мяцёлка“ | 12 |
| Гульня ”Каза“ | 12 |
| Гульня ”Падхват“ | 13 |
| Сцэнарый свята ”Каляды“ | 13 |
| Грамніцы | 17 |
| Гульня ”Дзяркач“ | 17 |
| Гульня ”Золата“ | 17 |
| Гульня ”Міхасік“ | 18 |
| Танец ”Какетка“ | 18 |
| Масленіца | 20 |
| Гульня ”Блін гарыць“ | 21 |
| Гульня ”Сценка“ | 21 |
| Ігровая программа ”Масленіца“ | 22 |
| Гуканне вясны | 31 |
| Гульня ”Журавель“ | 32 |
| Гульня ”Калім-бам-ба“ | 32 |
| Гульнёвая праграма ”Гуканне вясны“ | 33 |
| Вялікдзень | 35 |
| Гульня ”Качанне яек“ | 35 |
| Гульня ”Яйка пад шапкай“ | 35 |
| Юр’е | 36 |
| Гульня ”Вясокі дуб“ | 37 |
| Гульня ”Гуж“ | 37 |
| Гульня ”Маялка“ | 37 |
| Саракі | 38 |
| Гульня ”Гусі ляцяць!“ | 39 |
| Гульня ”Арол“ | 40 |
| Праздік народнага календара ”Саракі“ | 40 |
| Майстар-клас ”Падвясныя саламяныя птушкі“ | 47 |
| Маршрутная карта ”Стаячая птушка“ | 51 |
| Майстар-клас ”Драўляная цацка ”Салавей“ | 55 |
| Маршрутная карта ”Птушка ”Лебедзь“ | 57 |
| Майстар-клас ”Пернатые друзья“ | 59 |
| Выстава дзіцячай творчасці ”Птушкі роднага краю“ | 62 |
| Выстава малюнкаў ”Птушыны вырай“ | 65 |
| Літаратура | 67 |

## Уводзіны

> ”- Лепш прыходзь заўсёды ў адзін і той жа час, - папрасіў Ліс. – трэба прытрымліваца абрадаў.
> - А што такое абрады? – спытаў маленькі прынц.
> - Гэта таксама нешта даўно забытае, сказаў Ліс. – нешта такое, ад чаго адзін які-небудзь дзень становіцца непадобным на ўсе астатнія дні, адзін час – на ўсе іншыя часы“
>
> Антуан дэ Сэнт-Экзюперы

У сучасным грамадстве востра адчуваецца патрэба больш ведаць пра народныя святы і звычаі. Грамадскасць імкнецца адрадзіць самабытнасць, індывідуальнасць сваёй нацыянальнай культуры.

Славянскія народы заўсёды стараліся жыць у гармоніі з прыродай і верылі, што ўсе зямныя працэсы залежаць ад асаблівых дат, якія былі абумоўлены астранамічна. Святы ў старажытных славян называліся днямі сілы. Дзень сілы меў на ўвазе пад сабой прыліў пэўных энергій на зямлю, прычынай якому было тое ці іншае становішча Сонца і Месяца. Старажытныя святы не браліся ніадкуль, як гэта бывае з некаторымі святкаваннямі ў наш час, яны адзначалі пік пэўнай актыўнасці свяціла.

Беларускі народны каляндар, які ахоплівае дзень за днём усё гадавое кола, змяшчае ў сабе шматлікія абрады, звычаі, прыкметы, павер’і, прыказкі, прымаўкі, выслоўі праз якія глыбока раскрываецца ўнутраны свет працоўнага чалавека, яго штодзённыя клопаты і спробы разгадаць таямніцы навакольнай прыроды, жыцця і смерці. Шматвяковы вопыт, назапашаны многімі пакаленнямі папярэднікаў, з’яўляўся для земляроба азбукай і граматыкай усяго яго жыцця. Перададзеныя ў спадчыну народныя веды дапамагалі арыентавацца ў з’явах прыроды, ад якіх нярэдка залежаў ураджай - крыніца існавання селяніна, усёй яго сям’і.

У працэсе гістарычнага развіцця чалавецтва ў значнай меры навучылася разумець мову прыроды і кіравацца яе падказкамі ў сваіх будзённых справах.

Канкрэтныя дні года і цэлыя перыяды ўспрымаліся селянінам як своеасаблівыя паказчыкі для прыняцця тых ці іншых мер у гаспадарчых справах. Многія з гэтых дзён акружаліся магічнай таямнічасцю, комплексам патрабаванняў, парушэнне якіх, ва ўяўленні сялян, магло прынесці шмат шкоды. Таму так трывала ўрасталі карэнні розных прыкмет, вераванняў у свядомасць людзей. Вядома, сёння звесткі, пачэрпнутыя з народнага календара, мала кім бяруцца напавер як непахісныя правілы,

рэкамендацыі. І гэта натуральна, бо на нашых вачах рэзка мяняецца клімат, значна пагаршала апошнім часам экалагічная абстаноўка на ўсёй планеце - і Беларусь не стала тут выключэннем, а хутчэй, наадварот, увабрала, як ні адзін іншы край, сумныя вынікі цывілізацыі. Аднак народны каляндар і цяпер не страціў сваёй каштоўнасці і працягвае выклікаць інтарэс у сучаснікаў як своеасаблівы помнік вуснай творчасці беларускага народа.

Кожны дзень года ў хрысціянскіх календарах (як праваслаўным, так і каталіцкім) быў запоўнены імёнамі святых, прарокаў, апосталаў, пакутнікаў. Не ўсе яны, зразумела, адзначаліся ў будзённым жыцці роўнай увагаю. Адны даты праходзілі зусім непрыкметна; з другімі звязаны паасобныя павер'і, парады выконваць ці, наадварот, не выконваць тую ці іншую працу, трэція шанаваліся як вялікія святы і былі акружаны абавязковымі ўрачыстымі абрадамі.

Беларускі народны каляндар раскрывае перад намі складаны светапогляд беларускага селяніна, яго глыбокае веданне прыроды і любоў да яе, цягавітасць да працы, дэманструе багатыя творчыя здольнасці. невычэрпную фантазію, палёт дапытлівай думкі.

## Абгрунтаванне праекта

У нашай краіне ў апошнія гады ўсё больш актыўна распрацоўваюцца і ўкараняюцца новыя падыходы да захавання і развіцця традыцыйнай народнай культуры.

Сёння, калі мы разважаем аб адраджэнні беларускай культуры, якая набывае новыя якасці і масштаб, перш за ўсё думаем аб народнай творчасці, аб пашырэнні яе ролі ў нашым жыцці, аб аднаўленні адносін да яе. Каб дрэва зелянела і расло, неабходна ўмацаваць яго карані. І тут нельга перабольшыць тую ролю, якую можа і павінна адыграць народная творчасць у выхаванні пакаленняў, у далучэнні іх да культуры, мастацтва, творчасці, да народных традыцый.

Галоўная мэта этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі ў сістэме дадатковай адукацыі заключаецца ў стварэнні эфектыўных педагагічных умоў для ўкаранення этнакультурнага кампанента ў педагагічны працэс, у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці.

Менавіта культурна-гістарычная спадчына сваёй радзімы – гэта падмурак адзінства нацыі. У сучасных умовах сродкі масавай інфармацыі выцясняюць самабытную традыцыйную культуру, аддаляюць маладое пакаленне ад мінулай самабытнай культуры народа, губляюцца карані. Гэтую праблему мы паспрабавалі вырашыць праз рэалізацыю адукацыйных праграм ”Залатая саломка“, ”Спадчына“, ”Прырода і фантазія“, ”Фальклорная спадчына“ і рэалізацыю праектаў ”Традыцыі і сучаснасць“, ”Герб маёй малой радзімы“, ”Сламяны ”павук“ – сімвал дабрабыту сям'і“, ”Беларусь святочная“.

У зборніку паказаны вопыт работы Шумілінскага раённага цэнтра дзяцей і моладзі па рэалізацыі адукацыйнага, творчага праекта ”Беларусь святочная“.

**Інфармацыйная карта праекта**

| Структурны кампанент | Змест |
|---|---|
| **Назва праекта** | ”Беларусь святочная“ |
| **Тып праекта** | Адукацыйны, творчы праект |
| **Адукацыйная вобласць** | Беларуская народная творчасць, краязнаўства |
| **Асноўная ідэя праекта** | Прыцягненне дзяцей да сумеснай дзейнасці па вывучэнню народных свят і абрадаў на Шумілншчыне |
| **Мэта праекта** | Стварэнне ўмоў для арганізацыі актыўнай творчай дзейнасці дзяцей, якія забяспечваюць грамадска-патрыятычнае выхаванне асобы праз вывучэнне народных традыцый |
| **Задачы праекта** | Прадоўжыць работу па вывучэнню традыцый сваёй малой радзімы шляхам пашырэння ведаў вучняў аб народных святах і абрадах;<br>Арганізаваць сумесную дзейнасць педагогаў і навучэнцаў пры правядзенні святаў;<br>Выхоўваць пачуццё гордасці да гісторыі сваёй радзімы, калектывізму |
| **Удзельнікі праекта** | Навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах Шумілінскага РЦДіМ, педагогі дадатковай адукацыі, бацькі навучэнцаў |
| **Сацыяльныя партнёры** | Шумілінская раённая бібліятэка, сельскі дом культуры в. Полькавічы |
| **Тэрмін рэалізацыі праекта** | 2019/2020 навучальны год |
| **Матэрыяльна-тэхнічныя ўмовы** | Выбар аптымальных умоў і пляцовак для правядзення мерапрыемстваў праекта;<br>Наяўнасць матэрыялаў для афармлення памяшканняў і творчасці дзяцей;<br>Падрыхтоўка аўдыё- і відыёматэтыялаў. |
| **Метадычныя ўмовы** | Наяўнасць інфармацыйных рэсурсаў;<br>Распрацоўка сцэнарыяў народных свят, гульняў, майстар-класаў у адпаведнасці з планам рэалізацыі праекта;<br>Падрыхтоўка і правядзенне мерапрыемстваў. |

## Этапы рэалізацыі праекта

### 1. ПАДРЫХТОЎЧЫ ЭТАП.

**Задачы:**

прыцягненне дзяцей і педагогаў да ўдзелу ў распрацоўцы праекта;
арганізацыя інфармацыйна-рэкламнай дзейнасці.

**Змест дзейнасці:**

- вызначэнне ідэі і выбар тэмы праекта;
- стварэнне арганізацыйнай групы, планаванне сумеснай дзейнасці;
- вывучэнне літаратуры і інтэрет-рэсурсаў па тэме;
- складанне плана асноўных мерапрыемстваў праекта.

### 2. АСНОЎНЫ ЭТАП.

**Задачы:**

далучэнне дзяцей, бацькоў, педагогаў да сумеснай дзейнасці, накіраванай на рэалізацыю праекта;
узаемадзеянне з сацыяльнымі партнёрамі.

**Змест дзейнасці:**

- вывучэнне традыцый абрадаў ”Каляды“, ”Масленіца“, ”Саракі“;
- падрыхтоўка сцэнарных распрацовак абрадаў, майстар-класаў, гульняў;
- правядзенне святаў ”Каляды“, ”Масленіца“, ”Саракі“;
- правядзенне майстар-класаў у рамках свята ”Саракі“;
- правядзенне конкурсу чытальнікаў ”Птушкі – нашы сябры“.

### 3. ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП.

**Задачы:**

падвядзенне вынікаў рэалізацыі праекта;
сістэматызацыя метадычных матэрыялаў.

**Змест дзейнасці:**

падрыхтоўка матэрыялаў зборнікаў: ”Дзень за днём“;”Беларусь святочная“; ”У народзе кажуць…“.

## Чакаемыя вынікі

Рэалізацыя праекта ”Беларусь святочная“ дае магчымасць актывізаваць дзейнасць вучняў па вывучэнню гісторыі народных свят і абрадаў, удасканальваць формы і метады арганізацыі вольнага часу дзяцей і моладзі, садзейнічаць фарміраванню згуртаванасці калектыву.

## План асноўных мерапрыемстваў праекта

| Тэрмін рэалізацыі | Назва мерапрыемства |
|---|---|
| **верасень-лістапад** | Вандроўка юных фалькларыстаў. Збор інфармацыі пра народныя святы, гульні, танцы. Распрацоўка сцэнарыяў мерапрыемстваў. |
| **студзень** | Свята ”Каляды“;<br>Выстава дзіцячай творчасці ”Калядныя матывы“ |
| **люты** | Свята ”Грамніцы“;<br>Свята ”Масленіца“ |
| **сакавік** | Свята ”Саракі“;<br>Майстар-класы ”Падвясныя саламяныя птушкі“, ”Драўляная цацка ”Салавей“, ”Лебедзь“, ”Пернатые друзья“;<br>Выстава дзіцячай творчасці ”Птушкі роднага краю“<br>Выстава малюнкаў ”Птушыны вырай“ |
| **красавік** | Свята ”Гуканне вясны“;<br>Конкурс чытальнікаў ”Птушкі – нашы сябры“;<br>Свята ”Вялікдзень“. |
| **май** | Свята ”Юр’е“ |

## Даследчая дзейнасць

У нашых продкаў было выразна сфарміравана ўяўленне пра цыклічнасць жыцця. І гэта яскрава выяўляецца ў каляндарна-абрадавых святах, цесна звязаных з кругаваротам сонца і земляробчай працай селяніна. Сёння мы не можам спадзявацца на адраджэнне абрадаў у сваім першародным выглядзе: разбураны спрадвечны ўклад жыцця, страчана магічная сувязь селяніна з зямлёй, сонцам, сіламі прыроды. Прапанаваныя намі сцэнарыі Масленіцы, Саракоў, Каляд усё ж даюць магчымасць наблізіць духоўную спадчыну продкаў да сучаснага чалавека.

Святы - сукупнасць звычаяў і абрадаў, якія ўзніклі ў першабытным грамадстве. Яны былі звязаны з каляндарным (гуканне вясны, грамніцы) ці зямельнымі цыкламі.

У рамках праекта ”Беларусь святочная“ аўтары імкнуліся даследаваць асаблівасці, адметныя рысы народных каляндарна-абрадавых свят Шумілінскага раёна і паказаць, як яшчэ не так даўно гэтыя святы адзначаліся нашымі продкамі. Прадметам асобнай работы сталі распрацоўкі сцэнарыяў свят народнага календара, народных гульняў, танцаў, майстар-класаў. Народныя гульні найлепш спрыяюць фарміраванню нацыянальнай свядомасці, развіццю фізічных і інтэлектуальных здольнасцей дзяцей, пазнанню гісторыі, быту, народнай творчасці.

## Вандроўка юных фалькларыстаў

На працягу некалькі год вучні аб’яднанняў па інтарэсах ”Спадчына“, ”Вясёлка“, ”Фальклорная спадчына“ ладзяць фальклорныя вандроўкі. Яны сустракаюцца з жыхарамі населенных пунктаў Шуміліншчыны. Сталыя людзі распавядаюць навучэнцам пра асноўныя святы народнага календара, пра тое, што ў традыцыйнай абраднасці нічога не было выпадковым, непатрэбным, усё падпарадкоўвалася пэўнай мэце і адпавядала пэўным прынцыпам, маральным нормам, светаўспрыманню.



*Сустрэча з сям’ёй Мілашкіных, вёска Амбросавічы*



*Гутарка з Варанковай Н. П., вёска Амбросавічы*



*Падчас сустрэчы з Ларысай Іванаўнай Цыркуновай, кіраўніком народнана фальклорнага калектыву ”Гульбічы“*

**Народны фальклорны калектыў ”Гульбічы“** Шумілінскага раённага Цэнтра культуры створаны ў 1988 годзе.



У 1994 годзе калектыву прысвоена ганаровае званне ”народны“.

У складзе калектыву – работнікі адукацыі і культуры – аўтэнтычныя носьбіты, якія пераймаюць выканаўчае майстэрства Шумілінскага раёна.

Інструментарый складаюць баян, гармонік, скрыпка, цымбалы, трашчоткі, барабан, бубен.

У рэпертуары – абрадавы і пазаабрадавы фальклор у аўтарскай стылізацыі вусна-паэтычнага і музычнага тэкстаў. У праграме выкарыстоўваюцца ўзоры песеннай традыцыі ў выкананні аўтэнтычных носьбітаў. Для калектыўнай творчасці характэрна песенная (асабліва прыпевачная) імправізацыя.

У канцэртнай выканаўчай практыцы стылістычна адноўлены абрады і святы: ”Каляды“, ”Юр’я“, ”Вялікдзень“, ”Талака“, ”Зажынкі“, ”Масленіца“. Створаны аўтарскія сцэнічныя прадстаўленні: ”Шумілінская кадрыля“, ”Справы сардэчныя“, ”Кірмашоўскія замалёўкі“, ”У купальскі вечарок“, ”Вянок беларускіх полек“.

Калектыў – удзельнік і дыпламант розных мерапрыемстваў, сярод якіх: Усебеларускі фестываль народнага мастацтва «Беларусь – мая песня»,

Міжнародны фестываль мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“, Міжнародны фестываль песні і музыкі ”Дняпроўскія галасы ў Дуброўне“, Міжнародны фестываль ”Латышская Масленіца“, Міжнародны фестываль-кірмаш нацыянальных культур, традыцый, рамёстваў, фальклору (г. Лодзь, Польшча,) і іншыя. Заснавальнік і нязменны кіраўнік калектыву – Цыркунова Ларыса Іванаўна.

# Каляды

Слова ”каляды“ паходзіць ад лацінскага ”colendae“, што ў старажытных рымлян азначае першы дзень кожнага месяца. Асабліва шырока ў рымлян святкавалася навагодняя ”календа“. Традыцыя адзначаць навагоднія ”календы“ была засвоена і славянскімі народамі, у тым ліку беларускім. Каляды – свята шматдзённае, з трыма куццямі і трыма калядамі. Гэта пара батлейкі.

Каляды святкуюцца з 7 па 19 студзеня. Каляды – гэта народны аграрны абрад дахрысціянскага паходжання, асноўным прызначэннем якога было паскорыць набліжэнне цёплых дзён і пры дапамозе магічных дзеянняў забяспечыць добры ўраджай у надыходзячым годзе. На працягу Каляд выкарыстоўваліся розныя магічныя абрады і дзеянні.

Характэрнай рысай Каляд была таксама варажба. Варажылі пра будучага мужа ці жонку, пра жыццё ў будучыні, багацце, здароўе і іншае. На працягу Каляд моладзь наладжвала гульбішчы. Распаўсюджанымі былі гульні ”Цярэшка“, ”Яшчур“, ”Каралевіч“. Больш за ўсё гулялі ў ”Жаніцьбу Цярэшкі“. Гэтыя гульні адлюстроўваюць ідэю стварэння новай сям’і, новага жыцця ў надыходзячым годзе.

Цэнтральнай падзеяй у калядным свяце было так званае калядаванне: абход сялянамі дамоў аднавяскоўцаў з выкананнем калядных песень. Людзі былі пераапрануты ў розныя маскі: казы, авўка, мядзведзя, жураўля, цыгана, гаспадара і інш. Галоўная маска Каляд – Каза. Яе вядучая роля вызначалася тым, што ў старажытнасці лічылася здольнай узмацняць урадлівасць зямлі. У віншавальных песнях абавязкова выказваліся пажаданні, каб быў добры ўраджай, каб жывёла дала вялікі прыплод і г.д. Пажаданні гэтыя заканчваліся просьбамі аб узнагародзе за спевы. Лічылася, што пажаданні калядоўчыкаў здзейсняцца, калі гаспадар іх шчодра адорыць.

З цягам часу светкаванне Каляд станавілася ўсё больш займальным і пацешным. На Шумілёншчыне гэта свята цяпер адзначаецца. У Шумілінскім РЦДіМ і амаль ва ўсіх установах адукацыі раёна праходзяць калядныя вячоркі. Навучэнцы аб’яднання па інтарэсах ”Спадчына“

(педагог дадатковай адукацыі Шумкова Святлана Анатольеўна) калядаваць ходзяць па вёсках.

Шырокае распаўсюджанне на Шумілiншчыне маюць розныя зімовыя забавы – бой у снежкі, катанне з гор на санках.

## Гульня ”Мяцёлка“

**Мэта:** Садзейнічаць развіццю хуткасці рэакцыі, спрытнасці, назіральнасці.



**Інвентар:** мяцёлкі (пучкі галінак), 3-5 ледзякоў (асколкаў лёду або змёрзлых снежак) дыяметрам 5-7 сантыметраў.

**Апісанне гульні:** На лёдзе (снезе) чэрцяць круг дыяметрам 7-14 метраў. У цэнтры яго робяць адзнаку - ”мету“. На лініі круга, на аднолькавай адлегласці адна ад адной кожны ігрок капае лунку шырынёй 15-30 і глыбінёй 5-7 см. Устанаўліваецца чарговасць, і першы ігрок кладзе лядзяк на ”мету“, а астатнія – за лініяй круга, і ўсе гуляючыя займаюць месцы каля сваіх лунак.

Ігрок, лядзяк якога ляжыць на ”меце“, ударае мяцёлкай па лёдзе. Іграки бягуць да ”мэты“ і, дзейнічаючы сваімі мяцёлкамі, стараюцца ”замесці“ лядок у сваю лунку.

Калі лядзяк ”замецен“, наступны ігрок кладзе на мету свій лядзяк. Іграки вяртаюцца да сваіх лунак, і гульня працягваецца, пакуль не будуць ”замецены“ ўсе ледзякі. Пераможцам аб’яўляецца той, зто ”замяце“ ў сваю лунку найбольшую колькасць ледзякоў.

## Гульня ”Каза“



**Мэта:** Садзейнічаць развіццю спрытнасці, хуткасці рэакцыі.

**Інвентар:** калочак, вяроўка дашжынёй 2-3 м, кожны ігрок павінен мець адзін невялікі прадмет – шапку, шышку, мяч і інш.

**Месца правядзення:** пляцоўка, зала.

**Апісанне гульні:** Гуляючыя строяцца ў круг і перакідваюць адзін адному прадметы, якія трымаюць у руках. Той, хто не зловіць, становіцца ”казой“, астатнія разлічваюцца па парадку нумароў, пачынаючы злева ад ”казы“. Пасля гэтага на сярэдзіне пляцоўкі ўбіваюць калочак, да якога прывязваюць вяроўку. Вакол калочка гуляючыя кладуць свае прадметы.

Трымаючы ў руцэ свабодны канец вяроўкі, ”каза“ па камандзе бяжыць вакол калка, а астатнія гуляючыя стараюцца схапіць свае рэчы і адбегчы ад ”казы“ далей. Калі ”каза“ паспее каго-небудзь ”забасці“ (дакрануцца рукой ці вяроўкай), той становіцца ”казой“. Калі не – гульня паўтараецца.

## Гульня ”Падхват“

**Месца правядзення:** заснежаны схіл гары.

**Інвентар:** санкі, шышкі або іншыя невялікія прадметы.

**Мэта:** садзенічаць развіццю спрытнасці.

**Апісанне гульні:** На схіле ўздоўж накатанай каляіны раскладваюцца шышкі. З’язджаючы з гары, ігрок павінен на хаду падхапіць іх. Па колькасці сабраных шышак вызначаюць пераможцу. Пасля спуску кожны кладзе шышкі на месца.

*Умовы гульні:* нельга тармазіць або спыняць санкі каля шышак.

## Сцэнарый свята ”Каляды“

*Шумкова Святлана Анатольеўна,*
*педагог дадатковай адукацыі*

*На сцэне калядоўшчыкі з казою і каляднаю зоркай. Яны співаюць песню”Ехала Каляда з двара“*

Ехала каляда з вечара, з вечара.
Па вуліцы калядуючы, калядуючы.
Прыйшла каляда пад цясовы двор.
Добрага дня вам, людзі добрыя.

**1 удзельнік:** А мы хадзілі, гулялі калядоўшчыкі.

**2 удзельнік:** Прыйшлі, прыгулялі да вашага слаўнага гораду.

**3 удзельнік:** Дзядзечкі, цётачкі, хлопчыкі, малодачкі, сустракайце гасцей калядоўшчыкаў.

**4 удзельнік:** Гаспадары, гаспадынькі, паны, пані ды паненкі слаўнага горада Шуміліна. Ці дазволіце тут у вас пакалядаваці, пагуляці, паскакаці?

**5 удзельнік:** Песні паспяваці.
Вас усіх павіншаваці.
Дабрабыту пажадаці.

**6 удзельнік:** А заадно і паспытаці: ”Ці шчодрыя вы, каб нас пачаставаці?“.

*Калядоўшчыкі співаюць песню ”А дзень добры таму“, ”Добры вечар“*

А дзень добры таму. Ой, каляда.
Хто ў гэтым даму. Ой, каляда.
А ў гэтым даму. Ой, каляда.
Слаўны гаспадар. Ой, каляда.
Слаўна гаспадынька. Ой, каляда.

Усе людцы гожы. Ой, каляда.
У сукенках прыгожых. Ой, каляда.

**1 удзельнік:**

Добрыя людцы слаўнага горада Шуміліна!
Станьце, паслухайце, што ў небе гудзе?
Прачыстая ідзе, тры радасці нясе.

**2 удзельнік:**

Першая радасць вам у дамочку.
Другая радасць вам у кашалёчку.
Трэцяя радасць у чыстым полі.

**3 удзельнік:** У вашым дамочку добрыя дзеткі.
**4 удзельнік:** У кашалечку многа грошай.
**5 удзельнік:** У чыстым полі буйна жыцечка.
**6 удзельнік:** Буйна жыта каласіцца, ядраніста
**7 удзельнік:** Кладзіце копачкі як у небе зорачкі.
**8 удзельнік:** Кладзіце стожкі на 4 рожкі.

*Калядоўшчыкі спяваюць песню ”На нова лета“*

**1 удзельнік:** Сета, сета, на новае лета ідзем вакол света. Каня з казой вядзем ды радасць нясем.

**2 удзельнік:** Ідзем ад пана года, што носіць бараду шырокую, сівую і касматую.

**3 удзельнік:** Мы к лету ідзем, дабрабыт і шчасце нясем.
**4 удзельнік:** А дзе каза ходзіць - там жыта одзіць
**5 удзельнік:** А дзе каза рогам - там жыта стогам.
**6 удзельнік:** А дзе каза хвастом – там жыта кустом.
**7 удзельнік:** А дзе каза нагой – там жыта капой.

**Дзед**:

Каза мая вучоная, яна к таму хрышчоная.
Нутка, козачка, разыдзісетка,
Усяму народу пакланісетка.

*Калядоўшчыкі спяваюць песню ”Го-го каза“ Каза падае.*

Го-го-го каза, го-го-го шэрая.
Дзе ж ты была?
- Ягадкі брала.
Ой, ты козанька, ой, ты шэрая,
Не хадзі туды, у тое сяло.
Бо ў тым сяле ліхія стральцы.
Яны радзяцца козаньку забраць.
Хто казу вядзе, каляду бярэ.

І калядзіцу, і каўбасілу,
Мерачку аўса, песенька ўся.

**Дзед:** Ой, што гэта стала
Каза мая ўпала, здохла, прапала.

**1 удзельнік:** А каб каза ўстала, трэба даць ёй сала.

**2 удзельнік:** А на кожны ражок, трэба павесіць піражок.

**3 удзельнік:** І мерачку аўса, каб каза пайшла.

**4 удзельнік:** І мерачку жыта, каб каза была сыта.

*Калядоўшчыкі спяваюць:*

А мы козачку прагналі ды да вашага двара.
А ў гэтым двары бабака бліноў напякла.
Хто не дасць нам бліноў, мы кароўку забяром.
Хто не дасць нам пышку, таму ў лоб шышку.
Адчыняйце кашалёк, даставайце пятачок.
Хто не дасць нам пятачок, таму шышка на бачок.

**1 удзельнік:** Гаспадынька-журавіначка, не марыце вы нас, адарыце вы нас.

**2 удзельнік:** А хто калядоўшчыкам дае, таму Бог тройчы аддае.

**3 удзельнік:** Хто калядоўшчыкаў частуе, Бог таму жыцця не псуе.

*Калядоўшчыкі спяваюць:*

Хадзі бабка каля печкі. Ой Каляда.
Пашукай нам пеiражочкі. Ой Каляда.
Залезь дзядзька на драбінку
Пашукай нам саламінку.
Адрэж сала, не скупіся.
Каб ячмень твой урадзіўся.
І пшаніца радзілася.
І скацінка вадзілася.

*Праходзіць адорванне калядоўшчыкаў*

**Вядучы:**

Хай усяму свету будзе добра.
Хай сэрца сусвету радуецца.
Запаліся ж у вышыні чыстая Хрыстова зорка.
Хай твае зорныя прамені нашы сэрцы і душы ачысцяць.
Літасцівым агнём Любові і Радасці.

*Усе выконваюць песню ”У нядзельку рана“*

У нядзельку рана зорачка свяціла.
Святы вечар, багаты вечар.
Зорачка свяціла, дзіва абвясціла.
Божая Маці сына нарадзіла.

Сына нарадзілла, у пялены спавіла.
Анёлы святыя, калышыце сына,
Ды спявайце песні, песенькі святыя.
Дай, Божа, усяго вам, людзі добрыя!
І ў каморцы, і ў амбары.
На стайні вараныя коні.
Каровы брухатыя, ды валы рагатыя.
Курэй падпечак, ды яек засечак.
Жывіце ў роскошы, майце торбу грошай.
Дзякуй вам за вашы дары.
Будзем дарогай ісці, вышы цукеркі грысці.
Не будзем плясці, што цяжка нясці.
А будзем гаварыць, што умееце дарыць.
Ну а зараз бывайце,
На другі год нас чакайце.

*Песня ”Паехала Каляда“*

Паехала Каляда з канца ў канец
Каляда, каляда, калядзіца мая.
Прыехала Каляда к янку на двор…







*Калядкі ў в. Навікі. Аб’яднанне па інтарэсах ”Спадчына“*

**Выстава дзіцячай творчасці ”Калядныя матывы“**







# Грамніцы

Грамніцы (Грамнічнік, Стрэчанне, Устрэчанне) адзначаюцца 15 лютага. Грамніцы – дзень сустрэчы зімы з летам, свята свечкі і ”жывога агню“, які абараняе чалавека ад злых духаў. Гэта не зусім звычайны дзень, бо ў народзе існуе павер’е, што ў гэты дзень можа здарыцца навальніца, можна пачуць гром і ўбачыць маланкі. У гэты дзень у цэрквах асвячалі спецыяльныя свечкі-грамніцы. Іх запальвалі пры грымотах, калі выганялі кароў вясною, на засеўках, сустракаючы нованароджанага, у вясельных абрадах. Па стану надвор’я ў той дзень вызначалі будучае. Казалі: калі на Грамніцы нап’ецца певень вадзіцы, на Юр’я наесца вол травіцы; як на Стрэчанне рана ўзыходзіць сонца, то будзе ранні лён; калі снег перамятае цераз дарогу, то чакаецца позняя вясна. Са Стрэчання падумваюць ужо пра вясну. Кажуць: ”Да Грамніц не скідай з рук рукавіц, а як прайшлі Грамніцы, то ўжо не патрэбны рукавіцы“, ”Грамніцы – зімы палавіцы“.

## Гульня ”Дзяркач“

**Месца правядзення**: зала, пляцоўка.

**Мэта:** Садзейнічаць развіццю хуткасці рэакцыі, спрытнасці.

**Інвентар:** дзяркач.

**Апісанне гульні:** Музыкі граюць мелодыю, а ўсе танчаць па парах. Толькі адзін чалавек танчыць з дзеркачом. Як толькі скончыцца музыка, усе разбягаюцца, а той хто танчыў з дзеркачом, кідае яго і бяжыць шукаць сабе пару. Дарэчы, і ўсе астатнія таксама павінны знайсці сабе пару. А хто не знойдзе - танчыць з дзеркачом.

*Умова гульні:* папярэдняга партнёра браць ужо нельга.

## Гульня ”Золата“

**Месца правядзення**: зала, пляцоўка.

**Мэта:** садзейнічаць развіццю хуткасці рэакцыі, спрытнасці, назіральнасці.

**Інвентар:** ”Золата“ – невялікі каменьчык, гузік, манета.

**Апісанне гульні:** Гуляючыя садзяцца ў рад. Вядучы непрыкметна хавае ”золата“ ў руках каго-небудзь з ігракоў. Потым ён адыходзіць на 3-4 крокі і крычыць: ”Золата, да мяне “

Той, у каго схавана ”золата“, павінен усхапіцца і бегчы да вядучага. Але ўсе ўважліва сочаць адзін за адным і імкнуцца затрымаць ігрока з ”золатам“. Калі яму не ўдаецца выскачыць з рада, гульня пачынаецца спачатку, калі ж удаецца, - ён становіцца вядучым, а вядучы займае яго месца. Гульня працягваецца. Гуляючыя не павінны падаваць выгляду, што ”золата“ ў іх няма.

У гульню дзеці гуляюць некалькі разоў.

## Гульня ”Міхасік“

**Месца правядзення**: зала, пляцоўка.

**Інвентар:** абручы дыяметрам да 50 см, (на адно менш, чым гульцоў).

**Мэта**: садзейнічае развіццю хуткасці, спрыту.

**Апісанне гульні:** Абручы раскладваюцца па крузе, і вакол іх становяцца гульцы. Адзін з гуляючых (вядучы) гаворыць такія словы:

Ты, Міхаська, не зявай, не зявай!

Лапаточкі абувай, абувай!

Гучыць беларуская народная мелодыя, гульцы, танцуючы, рухаюцца па крузе. Як толькі музыка заканчваецца, усе спыняюцца і стараюцца як мага хутчэй ”абуць лапці“ - заняць свабоднае месца ў адным з кольцаў. Гулец, які застаўся без ”лапцей“, выбывае з гульні. Пасля гэтага адзін абруч забіраецца. Гульня працягваецца да той пары, пакуль не застанецца адзін гулец. Ён і лічыцца пераможцам.

Усе ігрышчы, па традыцыі, заканчваліся вясёлымі скокамі і танцамі.

Вывучэннем бытавых танцаў, народных песень на Шумілiншчыне займаецца Цыркунова Ларыса Іванаўна, кіраўнік народнага фальклорнага калектыву ”Гульбічы“ дзяржаўнай установы культуры ”Шумілінскі раённы цэнтр культуры“. Пра бытавы танец ”Какетка“ Ларысе Іванаўне ў 1977 годзе распавядала Меліхава Юлія Фядотаўна, ураджэнка вёскі Дабея Шумілінскага райна. Гэты танец танчылі ў вёсках Дабея і Лескавічы на вячорках. Адметная асаблівасць танца ”Какетка“ Шумілінскага рэгіёну - гэта крок і двайны прытоп.

## Танец ”Какетка“

Танец ”Какетка“ – гэта групавы парны танец, выконваецца па крузе па лініі танца (супраць гадзіннікавай стрэлкі).

Музычны памер - 2/4.

Апісанне танца



Перад пачаткам танца пары выстрайваюцца ў круг, тварам па лініі танца. Партнёр правай рукой трымае за левую руку партнёрку. Левая рука партнёра на поясе. Правая рука партнёркі злёгку адведзена ў бок.

Зыходнае становішча - 6 пазіцыя ног.

**Партыя партнёркі:**

**1 частка танца:**



1-ы такт:
на лік ”раз“ - крок правай нагой ўперад.
на лік ”і “, ”два“ - двайны прытоп.
на лік ”і“ - паўза.

2-ы такт:
паўтор першага такта.

3-ці такт:
на лік ”раз“, ”і“ - правая нага выстаўляецца на насок ўперад.
на лік ”два“, ”і“ - правая нага выстаўляецца на насок ў бок.

4-ы такт:
на лік ”раз“, ”і“ - правую нагу прыстаўляем ў зыходнае становішча.
на лік ”два“, ”і“ - паўза.
5-ы - 8-ы такты - гэта паўтор 1-га - 4-га такта.

**2 частка танца:**



1-ы, 2-і такты: паварот вакол сябе з правай нагі.



3-й такт:
на лік ”раз“, ”і“ – прысюды: правая нага наперад, левая назад, адначасова разводзячы іх наперад - назад.
на лік ”два“, ”і“ – прысюды: левая нага наперад, правая назад, адначасова разводзячы іх наперад - назад.

4-ы такт:

налік ”раз“, ”і“ - саскок на дзве нагі.

на лік ”два“ - ”і“ - паўза.



5-ы, 6-ы такты – паварот пад правай рукой партнёра з правай нагі.



7-ы, 8-ы такты – 3 хлапкі ў далоні партнёра.



**Партыя партнёра:**

Такая ж партыя, як і ў партнёркі, толькі з левай нагі.

У другой частцы танца на 5-ы, 6-ы такты - партнёр стаіць па 6 пазіцыі (падчас павароту партнёркі).

Танец паўтараецца па крузе некалькі разоў.

## Масленіца

Масленіца святкавалася ў другой палове лютага – першай палове сакавіка (восьмы тыдзень перад Вялікаднём). Узнікла гэтае свята ў дахрысціянскую пару і прысвечана было провадам зімы і набліжэнню вясны. Сама назва свята звязана з тым, што ў гэты час елі вельмі многа масленай ежы (бліноў масленых), мёду, сыру. Часта свята называлася словам Сырніца. Масленіца – гэта першае веснавое свята ў гонар сонца.

Таму ў вялікай пашане былі рэчы і з’явы, якія нагадвалі сонейка, былі круглай формы. На Масленіцу спявалася шмат песень. Яны былі больш вясёлымі, нават жартоўнымі, чым рускія і ўкраінскія. Гэта было вялікае народнае гулянне. Свята працягвалася цэлы тыдзень. Кожны дзень меў сваё прызначэнне. У святкаванні Масленіцы былі вытрыманы асноўныя моманты:

1. Святочная трапеза – бліны, аладкі.
2. Катанне на санках і на конях, ігрышчы, гушканне на арэлях.
3. Памінанне нябожчыкаў.
4. Провады Масленіцы.
5. Распальванне кастроў.
6. Масленічныя песні.
7. Звычай ”развітання“ (родныя просяць прабачэння адзін у аднога).

У г.п. Шуміліна гэта свята адзначаецца і ў наш час. Захаваліся толькі наступныя моманты: святочная трапеза (бліны, аладкі), катанне на санках і на конях, провады Масленіцы, звычай ”развітання“.

## *Гульня ”Блін гарыць“*

**Месца правядзення**: пляцоўка, зала.

**Інвентар:** вяроўка.

**Мэта:** садзейнічаць развіццю хуткасці, спрытнасці, хуткасці рэакцыі.

**Апісанне гульні:** Гульцы ствараюць круг з вяроўкі, у які і становяцца. Лавец, стаўшы спіной да круга на адлегласці 3-4 м, гаворыць: ”Блін гарыць!“. Усе выбягаюць з круга, але адразу ж імкнуцца забегчы ў яго зноў. Лавец у гэты час спрабуе запляміць (дакрануцца) каго-небудзь з гульцоў. Той, каго заплямілі, становіцца лаўцом, і гульня працягваецца.

*Умова гульні*: Лавец не мае права пляміць гульцоў, якія знаходзяцца ў крузе.

## Гульня ”Сценка“

**Месца правядзення:** снежная пляцоўка.

**Інвентар:** моцная вяроўка або доўгі шост (жэрдка)

**Мэта:** садзенічаць развіццю сілы, сілавой вынослівасці.

**Апісанне гульні:** Пасярэдзіне пляцоўкі будуецца снежная сценка вышынёй каля 1 м і даўжынёй 1-2 м. Упоперак яе укладваецца вяроўка. Затым гуляючыя дзеляцца на дзве роўныя па сіле каманды, ігракі якіх бяруцца за процілеглыя канцы вяроўкі. Па сігналу кожная каманда цягне вяроўку да сябе, імкнучыся паваліць праціўніка на снежную сценку. Каманда, якой гэта ўдаецца, выйграе.

# Игровая программа ”Масленица“

*Романова Светлана Юрьевна,*
*культорганизатор*

**Цель:** повышение интереса к традициям белорусского народа (праздник Масленица).

**Задачи:**

возрождать интерес к обрядовым народным праздникам;

обогащать духовный мир детей;

обобщить и закрепить знания детей о празднике ”Масленица“;

вызвать эмоциональное сопереживание и участие в игре-действии, приобщить всех участников к традиции проведения народного праздника Масленицы;

воспитывать чувство патриотизма, основанного на народных традициях.

*01. музыкальный фон*

Масленица, Масленица,
Дай блинком полакомиться.
Прогони от нас метели,
Прокати на карусели.
Растопи холодный лёд,
Пусть весна скорей придёт!

В. Степанов

*02. музыкальный фон (Выход ведущих)*

**Ведущая 1:** Добрый день, гости дорогие,
Жданные, званые и желанные.
Мы рады гостям, как добрым вестям!

Пригласили мы Вас на игровую программу ”Масленица“ в рамках цикла открытых воспитательных мероприятий по проекту ”Беларусь святочная“.

Проходите, не стесняйтесь
Сегодня Масленица приглашает в гости!
А мы Масленицу встречаем,
Да зиму провожаем, весну закликаем!

Этот яркий красочный праздник в конце зимы радует и малышей, и взрослых. Игры, песни, танцы, веселый смех и шум – главные его приметы. Правда, в некоторых регионах Беларуси этот праздник называют по-другому: Масленка, Сырница, а по церковному календарю ”Сырная седмица“. Эти ”молочные“ названия не случайны. В это время – когда праздновалась Масленица – на столе у крестьян появлялись молочные продукты в очень большом количестве, поэтому и становились главными

**Ведущая 2:** Масленица – один из самых древних славянских праздников. Определенной даты в календаре он никогда не имел: его начинали праздновать за восемь недель до Пасхи. Огромным плюсом этого праздника было то, что продолжался он целую неделю. По одной из версий наши предки стали отмечать этот праздник, чтобы почтить бога Велеса, который покровительствовал домашним животным. Показателен и тот факт, что церковь практически ничего не поменяла в языческом празднике. Древним обрядам просто придали некоторые религиозные черты.

**Ведущая 1:** Масло и сыр – вот обязательные атрибуты праздника. Кроме того, какая же Масленица без блинов? На масленичной неделе блины приобретали поистине королевское значение – их старались есть каждый день. Топленое масло, сметана, мед, варенье, рыба, икра, капуста – каждый заворачивал в блины все, что его душеньке угодно. Кроме мяса, разумеется. Праздничной неделе дали еще одно название – мясопустная неделя. Поэтому блинчики с мясом были под строжайшим запретом.

**Ведущая 2:** В разных регионах Беларуси праздновать Масленицу начинали по-разному: кто-то угощался блинами с понедельника, а кто-то терпел до четверга. Каждый день праздничной недели был особенным, требовал определенных действий.

*03. музыкальный фон*

**Ведущая 1:** А у нас на Шумилинщине праздновали Масленицу так

**День первый - понедельник! Встреча!**

*Звучит музыка, девочки выносят масленичное чучело, устанавливают в центре зала, затем ходят вокруг его и расхваливают по очереди.*

**1-я девочка.**

Здравствуй, Масленица годовая,
Наша гостьюшка дорогая!

**2-я девочка.**

Мы Масленицу величаем
И чего ей только не обещаем:
Реки сметанные,
Горы блинные.

**3-я девочка.**

Дорогая наша гостья Масленица,
Коса длинная, триаршинная,

**4-я девочка.**

Лента алая, двуполтинная!
Платок беленький, новомодненький,

**5-я девочка.**

Брови черные, наведенные.
Шуба синяя,ластки красные

**Ведущая 1:** Молчит наша Масленица, не отвечает!

Лишь рукавами соломенными качает!
**Ведущая 2:** Не иначе вас честной люд просит ответить на её загадки.

*Загадки*

**Ведущая 1:** Она сначала была на носу, а теперь она пришла, и не сама, а с весельем и блинами. (Масленица)
**Ведущая 2:** Растаял снежок, ожил лужок. День прибывает. Когда это бывает? (Весной)
**Ведущая 1:** Круглый, желтый, ароматный,
И на вкус такой приятный!
Словно солнышко горит,
Скушать быстренько манит,
Только мама испечет,
А он прыг и прямо в рот! (Блин)
**Ведущая 2:** Прогони от нас метели,
Прокати на карусели,
Растопи холодный лед,
Пусть весна скорей придет! (Масленица)
**Ведущая 1:** На плешь капнешь, вставишь, попаришь, вынешь, поправишь.

*(Пекутся блины)*

**Ведущая 2:** В землю - крошки, из земли - лепешки. (Зерно)
**Ведущая 1:** Ой, ты Лакомка-Среда! Масляная сковорода! Как повелось со старины – Едем к… ! (Тёще на блины)

**День второй! Заигрыши!**

**1-я девочка.**
Масленица - блиноеда.
Масленица - жироеда.
**2-я девочка.**
Масленица - обируха,
Масленица - обмануха.
**3-я девочка.**
Обманула - провела,
До поста довела.
**4-я девочка.**
До поста довела,
Всю еду забрала.
**5-я девочка.**
Дала редьки хвост на Великий пост.
**6-я девочка.**
Мы его поели - брюха заболели.
**Ведущая 1:** Для гостей, для друзей, для всех!
Начинаем панораму удивительных потех!

**Ведущая 2:** В старину на площади ставили высокий столб. А наверху всякие призы вешали: петух в клетке, сапоги и другой дорогой товар. Многие смельчаки пытались на него взобраться. Кто добирался доверху, получал

**Ведущая 1:** Кто из вас самый смелый и ловкий? Выходи - прояви сноровку! В игре участвует один человек.

04. музыкальный фон Игра ”Богатый приз“

*На площадке лежит длинный канат, на конце каната - приз. Нужно пройти по канату с завязанными глазами, ни разу не оступившись. Кто дойдет до конца, тот и получает приз.*

**Ведущая 1:** Как на Масленой неделе
Из трубы блины летели,
Уж блины, блины мои,
Вы блиночки мои.

**Ведущая 2:** У меня есть младшая сестрица,
Печь блины-то мастерица.
Напекла их кучек шесть.
Семерым их не поесть.
А сели четверо за стол,
Дали душеньке простор,
Друг на друга поглядели
И блины-то все поели.

**Ведущая 1:** Среди вас есть мастерицы, которые умеют печь блины? Выходите к нам.

*Дети выходят*

**Ведущая 2:** Мастерицы - хоть куда!
Вот вам и сковорода!
Принимайтесь-ка за дело,
Всех блинами угощайте смело.

*05. музыкальный фон*

Игра ”Спеки блин“. *В игре участвуют 2 команды по 4 человека. Для игры: 2 теннисных ракетки, ”блины*“- *шарики, блины настоящие, Задача участников - быстро ”испечь*“ *блины.*

**Ведущая 1: Четверг! Широкая Масленица!**

**Ведущая 2:** Ой, было, давно это было. Да и по сей день осталось. Добры молодцы собирались на площади силой своей померяться да затеять кулачные бои.

**Ведущая 1:** Приглашаем самых сильных, смелых, ловких посостязаться. (8 человека)

*06. музыкальный фон*

Игра ”Снежный бой“. Выбираем ловких - *(игра выбивала).* Сильных - ”Петушиный бой“. *(На площадке лежит обруч, в который становятся 2*

*участника, левой рукой нужно держать свою левую ногу, а правым плечом, без помощи рук, вытолкнуть соперника из круга.)* Смелых - ”Танец“

*07. музыкальный фон*

**Ведущая 2:** Ай да Масленица - веселуха!
Всех рассмешила да позабавила!

**Ведущая 1:** Хватит играть! Пора пятницу объявлять!

**Ведущая 2: Пятница - ”Тещины вечерки“!**

**Ведущая 1:** 5-й день уж наступает, а народ не убывает!

**Ведущая 2:** К теще на блины идём

**Ведущая 1:** К теще катаемся, блинами объедаемся.

**1-я девочка.**
В пятницу теща зятя в гости ждала.

**2-я девочка.**
Теща для зятя пироги пекла.

**3-я девочка.**
Зять на двор - пироги на стол.

**4-я девочка.**
Думала теща - семерым пирог не съесть.

**5-я девочка.**
А зятюшка сел - да с присеста съел!

**Ведущая 1:** Настала пора в гости звать,
да зятя для тёщи выбирать.

**Ведущая 2:** *Передаём под музыку полено, на ком музыка остановиться тот и зять (если полено остановился у девочки, она передаёт мальчику, который ближе)*

*08. музыкальный фон ”Игра Полено“*

**1-я девочка.**
Будешь зятем?
Мальчик отвечает

**Ведущая 1:** Вот тебе колода, – нужно откупиться *(что-то рассказать или что-то дать, затем остальные)*

**Ведущая 2:** Не нашли мы зятя в этот раз, найдётся в следующем году

**Ведущая 1: А в субботу не безделки - ”Золовкины посиделки“**

**Ведущая 2:** Невестки в гости друг друга приглашают, всех потчуют, угощают.

*(девушки сидят на лавочках, рассказывають).*

**1-я девушка** Столы стоят дубовые.
Скатерки веселые.

**2-я девушка**. На скамеюшках
Лясы точат, угощеньице просят.

**3-я девушка**. Сладкий медок
По столам разливается,

Горками блины
На столах румянятся
С этого-то боку режь,
Ан с другого-то боку - Макай да ешь.

**Частушки**

**1-я девушка**.
Мы частушки пропоем,
Как мы Масленицу ждем,
Как тоскуем по блинам
И по теплым вешним дням.

**2-я девушка**.
Мы при всём честном народе
Вам частушки пропоём,
Зиму-матушку проводим
И весну встречать начнём.

**3-я девушка**.
Веселись, честной народ,
В гости Маслена идёт!
От души её встречай,
Всех блинами угощай!

**4-я девушка**.
Мы на масленой неделе
Праздник не нарушили,
Все друзья плясали, пели,
Да блиночки кушали!

**5-я девушка**.
В нашем классе кулинарки
Ловкие, умелые!
Все в нарядных платьях ярких,
А блины – горелые!

**6-я девушка**.
Все девчонки в ночь гадали,
Дружно кинули башмак.
Мишке в голову попали,
Во весь лоб теперь синяк!

**7-я девушка**.
Бой снежками не на шутку,
Катя громче всех ревёт:
Ей снежок попал под шубку,
А второй – в открытый рот.

**Ведущая 1:** Развлекали весь народ, а теперь и ваш черёд.

**Ведущая 2:** Скоморох подводка под лото

**Лото**

| | |
|---|---|
| Веселей играй, гармошка,<br>Масленица, не грусти!<br>Приходи, весна, скорее,<br>Зиму прочь от нас гони! | Приходите, заходите<br>На румяные блины.<br>Нынче Маслена неделя –<br>Будьте счастливы, как мы! |
| Как на Масленице нашей<br>Всем становится теплей.<br>Уходи, зима, подальше,<br>Нам с блинами веселей. | Уминая всласть ватрушки,<br>Поют девицы частушки.<br>Всякий люд кругом танцует,<br>И душа его ликует. |
| Прилетали марсиане,<br>Все они довольные.<br>Их тарелки не пустые,<br>А блинами полные. | Пятый блин я слопала,<br>На мне юбка лопнула.<br>Пойду юбку зашивать,<br>Чтобы есть блины опять. |
| Как на масленой неделе<br>На столы блины летели!<br>С пылу, с жару, из печи,<br>Все румяны, горячи! | Блин с вареньем, блин с икрою!<br>С родниковою водою!<br>Праздник солнца к нам пришел!<br>На душе так хорошо! |
| Все заботы ваши бросьте,<br>Приходите срочно в гости,<br>Прямо к нашему крыльцу<br>К нам на Масленицу! | Если хочешь быть здоровым,<br>Скушай блинчик с молоком,<br>Если хочешь быть веселым –<br>То с соленым огурцом! |
| Масленица шумная,<br>Праздник удалой!<br>В этот день прощаемся,<br>Зимушка, с тобой. | Мы сжигаем чучело<br>Снега, холодов,<br>Чтоб весна-красавица<br>К нам вернулась вновь. |
| – До свиданья, – крикнем мы, –<br>Зимушка-зима!<br>Уходи, пожалуйста,<br>Поскорей сама! | Мы на Масляной неделе<br>Сто блинов, наверно, съели.<br>С мёдом, маслом и вареньем.<br>Вкуснотища! Объеденье! |
| Мы совсем-совсем недаром<br>Пили чай из самовара,<br>Ведь блинами с вкусным чаем<br>Мы всегда ВЕСНУ встречаем! | Ух, страшилку из соломы<br>Мы сожжём вдали от дома –<br>Это с Зимушкой прощанье.<br>Крикнем дружно: ”До свиданья!“ |
| С наступленьем воскресенья<br>Просим мы у всех прощенья.<br>Наши добрые стремленья<br>Вызывают восхищенье. | На прощанье весь народ<br>Масленицу подожжет.<br>Разгорайся поскорей,<br>Чтоб жилось нам веселей! |
| Мы Маслёну-хохотушку<br>Проводили на покой.<br>А теперь Весну-подружку<br>С солнцем встретим за рекой | Мы кончаем петь частушки<br>До другого вечера.<br>Вы сидите до утра,<br>Коли делать нечего |

**Ведущая 1: Вот и наступил последний день Масленицы. Воскресенье -** Прощеный день! Или Проводы Масленицы.

**Ведущая 2:** Со словами ”Простите Христа ради“ все просят друг у друга прощения, обмениваясь подарками. Воскресенье проходило очень шумно, с песнями и плясками, с обильными кушаньями. Считалось что надо было 7 раз сесть за стол, так как впереди был семинедельный пост.

**1-я девочка.**

Мы катались с горы от зари до зари,
А сегодня в воскресенье наше кончилось веселье.

**2-я девочка.**

Прощай-прощай, Масленица.
Ты прощай, прощай, широкая,

**3-я девочка.**

Ты не в среду и не в пятницу.
Ты в воскресенье, Всю неделю веселье.

**4-я девочка.**

А мы свою Масленицу прокатали,
дорогую свою потеряли.

**5-я девочка.**

Думали, будет она семь годков,
А она погостила семь деньков.

**6-я девочка.**

Ай, Масленица, воротись!
В новый год покатись!

***Танец** (Дети берут чучело Масленицы, обходят зал и уносят его.)*

*09. музыкальный фон Маша Карась песня ”Ой Вясна“*

**Ведущая 1:** Всем спасибо за веселье,

**Все вместе:** Коль что ни так - просим у вас прощенья.









*Пад час падрыхтоўкі і правядзення свята ”Масленіца“.*
*Шумілінскі РЦДіМ*



*Сустракаем Масленіцу. Аб’яднанне па інтарэсах ”Спадчына“, в Амбросавічы*

# Гуканне вясны

Гуканне вясны – гэта шматвечаровае (пачыналася яно апоўдні) народнае свята, якое мае глыбокія карані, што прараслі і прарастаюць у нашу сучаснасць з сівога язычніцтва. Гуканне вясны звязвалася з тым часам, калі сонца пачынала хадзіць вышэй, цяплей цалаваць зямлю і вызваляць з-пад снегу на схілах узгоркаў першыя лапікі праталін. Гэтыя праталіны ўсціталіся саломаю, на яе садзіліся гукальніцы-дзяўчаты і пачыналі спяваць песні-вяснянкі, у якіх кожны слупок заканчваўся выклічнікам ”Гу!“. Гэтымі песнямі яны гукалі Вясну, заклікалі, просячы: ”Ой, вясна-маці, хадзі к нам гуляці!“. Прасілі прыйсці хутчэй і прынесці ”цёплыя дзянёчкі, чыстыя дажджочкі“, каб абудзіць зямлю, прыроду, наблізіць тэрмін палявых работ, даць жыццё новаму ўраджаю.

У цэлым, час гукання вясны супадае са святам Дабравешчанне (7 красавіка). Дабравешчанне лічылася вялікім святам, святам прылёту бусла. ”На Дабравешчанне дзеўка касы не пляце, птушка гнязда не ўе“. Гэтаму павер’ю і цяпер прытрымліваюцца ў вёсках на Шуміліншчане. Кажуць, што ”на Мацея дарога пацее, на Саракі дрэвы адпускаюцца, на Аляксея рыба хвастом лёд ламае, а на Дабравешчанне бусел прылятае“. Ну а ”бусел прыляцеў - вясна будзе“. Бусел - птушка ў беларусаў няпростая. У гаспадароў, чый двор ён аблюбуе, год павінен быць удалым. Забіць пасланца вясны або зруйнаваць яго гняздо, лічылася вялікім грахом.

У народзе існавала легенда пра паходжанне бусла. Было гэта вельмі даўно. На зямлі развялося такое мноства гадаў, што не стала ад іх жыцця ні людзям, ні жывёлам. І парашыў адзін чараўнік знішчыць гадаў, паіапіць у якойсьці бяздонніцы. Сабраў ён іх у вялізны скураны мяшок, завязаў, узваліў на плечы аднаму неразумнаму чалавеку і загадаў укінуць у паказанае прадонне. Як толькі чалавек рушыў з месца, то ўсе гады, якія былі ў мяшку, заварушыліся, засіпелі, засвісталі. І ўзяла чалавека цікаўнасць, што ён такое нясе.

Чалавек развязаў торбу ды і аслупянеў ад жаху. Гады ж тым часам вылезлі і распазлліся ізноў па зямлі. Разгневаны чараўнік не захацеў другі раз збіраць гэтую дрэнь і, накінуўшы на чалавека парожні мяшок, ператварыў яго ў бусла і загадаў збіраць гадаў-уцекачоў усё яго жыццё аж да самай смерці.

І ходзіць гэты ператвораны ў бусла чалавек з накінутым на плечы мяшком па лугах, палях, балотах ды збірае гадаў, але да гэтай пары ніяк сабраць не можа. З прычыны сваёй крэўнасці да чалавека гэты пярэварацень не адыходзіць далёка ад людскіх сяліб і мала баіцца людзей.

## Гульня ”Журавель“

**Месца правядзення:** пляцоўка, зала.

**Інвентар:** вяроўка.

**Мэта:** садзейнічаць развіццю хуткасці, спрыту.

**Апісанне гульні:** Выбіраюцца ”журавы“. Астатнія становяцца ў круг, трымаючы ў паднятых уверх руках вяроўку (”сілкі“). Журавы, узмахваючы рукамі рухаюцца па зале, прабягаючы пад вяроўкаю і сярод удзельнікаў, якія ходзяць па крузе і спяваюць:

Сякі-такі
Журавель,
Журавель
Не еш маіх канапель, канапель.
Бо я табе, жураўлю, жураўлю,
Задам дыхту, як злаўлю, як злаўлю!

Па заканчэнні слоў (не раней!) дзеці апускаюць вяроўку, каб злавіць каго-небудзь з журавоў.

## Гульня ”Калім-бам-ба“



**Месца правядзення:** пляцоўка, зала.

**Інвентар:** не патрабуецца

**Мэта:** садзейнічаць развіццю хуткасна-сілавых якасцей, спрытнасці, сілы мышцаў рук.

**Апісанне гульні:** Гуляючыя становяцца ў дзве шарэнгі адна насупраць другой. Іграні бяруцца за рукі, і паміж шарэнгамі ідзе гаворка:

- Калім-бам-ба.
- На што слуга?
- Прышыць рукавы.
- На чые бакі?
- Пятае, дзесятае, (імя) сюды.

Названы ігрок бяжыць да процілеглай шарэнгі і спрабуе разарваць яе. Калі яму гэта ўдаецца, ён вядзе ў сваю шарэнгу аднаго з ігракоў каманды праціўніка. Калі не разарве, застаецца ў шарэнзе праціўніка.

Пераможуай лічыцца тая каманда, у якой у канцы гульні будзе больш гуляючых.

Умовы гульні: Ігрок павінен разарваць счэпленыя рукі ўдзельнікаў другой каманды, якія не маюць права пры яго набліжэнні раздымаць іх.

## Гульнёвая праграмма ”Гуканне вясны“

**1 дзяўчынка:** Дзяўчаты, збірайцеся, пойдзем вясну гукаць.

*Дзяўчаты ідуць карагодам песняй ”Пойдзем дзевачкі мы на луг гуляць“.*

**2 дзяўчынка:** Вось ля гэтых прыгожых бярозак прыпынімся.

**3 дзяўчынка:** Згодны? Добрае месца выбралі.

*Хто прыйшоў з кошыкамі, ставяць іх пад бярозку.*

**4 дзяўчынка:** Дазвольце нам вясну-красну гукаці.

**5 дзяўчынка**: Сцюдзёную зіму замыкаці.

**6 дзяўчынка:** Сцюдзёную зіму ў каморачку

**Усе:** А вясну-красну на вулачку.

*Самая старэйшая выходзіць на авансцэну з гліняным гаршочкам, поўным зярнят (пшаніцы) і гаворыць:*

**1 дзяўчынка:** Найперш, чым вясну гукаць,
Трэба зямліцу-матухну пачаставаць.
Прымі, зямліца-матухна, частаванне ад нас
На ціхае лета, на буйнае жыта.

**2 дзяўчынка:** Каб жыта наша ў трубы павілося,
У трубы павілося ды на бок схілілася.

**3 дзяўчынка:** На полі снапамі, а ў гумне тарпамі.

**4 дзяўчынка**: На таку ўмалотна, у клуні прысыпна.

**5 дзяўчынка:** У млыне прывольна, у дзяжы падходна.

**6 дзяўчынка:** У пячы пячыста, на стале краіста, сям'і на здароўе.

**Усе:** І к добраму жыццю.

*З гэтымі словамі грошок з зярнятамі ставяць на зямлю, закрываюць дзеразою. Праходзіць частаванне зямлі.*

**1 дзяўчынка:** Дык благаславіце, дзяўчынкі, вясну-красну пеці.

**2 дзяўчынка:** Бог благаславіць.

**3 дзяўчынка:** Другі раз.

**4 дзяўчынка:** Бог благаславіць.

**5 дзяўчынка:** Трэці раз.

**6 дзяўчынка**: Бог благаславіць.

*Пасля гэтых слоў усе спяваюць народную песню ”Вол бушуе – вясну чуе“.*

**1 дзяўчынка:** Што ж гэта мы пра вала спяваем. Ён таксама, яек і мы, па зямлі ходзіць. Далёка яму не бачна. Звернемся да птушак – жаваронкаў. Яны высока лятаюць, далёка бачаць. Яны то нам і дапамогуць хутчэй вясну-красну прыгукаці.

*Усе спяваюць песню ”Жавароначкі прыляціце“*

**Дзяўчаты ўсе разам:** Сонейка яснае, сонейка краснае. Вясне сілы надавай. На свет божы выпускай. *(загукальным тонам)* – У – у …, го – го –го –го…

**Вясна:** А – у – у

*З-за куліс выходзіць вясна з трыма месяцамі: сакавік, красавік, май.*

*Усе вітаюць вясну. Радуюцца яе прыходу.*

**Вясна:** Не адна я к вам прыйшла.
Пад ваш вясёлы шум і крык
Абудзіўся Сакавік.

*Сакавік выходзіць на сцэну са збаном бярозавага соку. Кланяецца 3 разы направа, налева, прама і гаворыць:*

**Сакавік:** Абуджаю дрэвы і расліны.
Людзей частую салодкім жыватворным сокам…

*Частуе ўсіх сокам, за кулісамі пакідае збан і выходзіць як удзельнік абрада.*

**Вясна:** Снег з палёў замерзлых знік,
І расціў падснежнік – у красавік.

*Красавік з кошыкам кветак.*

**Красавік:** Ізноў я з вамі карасавік.
Кветкі я дарыць прывык.

*Асыпае ўсіх кветкамі. Выходзіць за кулісы. Пакідае там кошык і вяртаецца як удзельнік абрада.*

**Вясна:** Яблыня цвіце на ўзмежку.
Добра ластаўцы ў застрэшку.
Зацвіце духмяны бэз –
Прыляціць зязюля ў лес.
Гэты увесь дзівосны рой
Абуджае месяц Май.

*Май выходзіць з гармонікам і іграе вясёлую ”Польку“. Усе ўдзельнікі танчаць. Вясна з кошыкам чароўным ходзіць пасярод сцэны.*

**1 дзяўчынка:** Ой, вясна, ой, красна, што ж ты людзям прынясла?
**Вясна:** Прынесла зялёную травіцу і цёплую вадзіцу.
**2 дзяўчынка:** Ой, вясна, ой, красна, што з кораба вытрасла?
**Вясна:** Я вытрасла з лукошка боб з гарошкам.

*Асыпае ўсіх гарохам.*

**3 дзяўчынка:** Ой, вясна, ой, красна, што яшчэ ты прынясла?
**Вясна:** Вашым хлопчыкам па свістку *(дае па свістку).*
Будзеце свістаці – на вуліцу дзяўчат зваці.
Вашым дзевачкам па вяночку. *(абыходзіць усіх дзяўчат, дае па вяночку).*
Каб шчаслівыя былі.
Каб працавітыя былі.
Каб не ленаваліся,
У кусты ад працы не хаваліся.
Каб каханымі былі
І памнажалі чалавечы род на зямлі.
**4 дзяўчынка:** Заспяваем жа, дзяўчаткі

**Усе:** Вяснянку спявай – вясну праслаўляй!

Спяваюць песню ”Вясна прыйшла“

**Вясна:** Людзі добрыя, вы гукалі мяне. І прыйшла я да вас пасля доўгай зімы. Я прынесла з сабою многа працы. Нездарма ў народзе кажуць: ”Веснавы дзень – год корміць“. А яшчэ ў народзе кажуць: ”Вучыся пець і танцаваць, а жыццё дзелу навучыць“.

Ну, а зараз я хачу з вамі паскакаць.
Запрашаю ў пары ўстаць,
Будзем весела плясаць.

*Танец ”Лявоніха“*

**1 дзяўчынка:** Ідзі, вясна, полем, шырокім раздоллем.
**Усе:** Вясна-красна на ўвесь свет.
**2 дзяўчынка:** Дзе вясна ступае – кветка расцвітае.
**Усе:** Вясна-красна на ўвесь свет.
**3 дзяўчынка:** Зерне засявае ды песню спявае.
**Усе:** Вясна-красна на ўвесь свет.
**4 дзяўчынка:** Радзі, радзі жыта на добрае лета.
**Усе:** Вясна-красна на ўвесь свет.

## Вялікдзень

У залежнасці ад календара свята Вялікдзень выпадае на розныя дні - паміж 4 красавіка і 8 мая. Апошняя нядзеля перад Вялікаднём называлася Вербніцай. У гэты дзень у царкве асвячалі галінкі вярбы, якой білі адзін аднаго з прыгаворам: ”Вярба б’е…. не я б’ю, за тыдзень – Вялікдзень, будзь здароў, не ўмірай, Вялікадня дачакай, ужо недалечка чырвона яечка. Будзь здаровы, як вада! Будзь багаты, як зямля!“

Галоўным момантам падрыхтоўкі святочнага стану душы да Вялікадня быў перадвелікодны сямітыднёвы пост. Да Вялікадня сяляне рыхтавалі вельмі старанна. Прыбіранне хаты ішло надзвычай рупліва. Вялікдзень лічыўся самым вялікім святам, вышэй за Каляды. Абавязкова напярэдадні пяклі пасху - высокі круглы хлеб з пшанічнай мукі, на версе яго выкладвалі з цеста крыж.

Сімвалам свята былі яйкі. Іх адварвалі ў шалупіне цыбулі, потым асвячалі ў царкве. Прыйшоўшы дадому, асвячонае яйка клалі ў ваду, гэтай вадой пасля мыліся, а дзяўчаты яйкам гладзілі твар, каб быць прыгожымі. У Вялікдзень вельмі папулярнымі былі гульні з яйкамі. Людзі ”біліся ў яйкі“, каб вызначыць, у каго будзе мацнейшае яйка. Яйкі таксама ”каталі“, для чаго часам рыхтаваліся спецыяльныя горкі. Тут перамагаў той, чыё яйка далей закоціцца. Лічыцца, што гэтая гульня звязана са старажытным абрадам катання яек у полі з мэтай апладнення зямлі, забяспячэння добрага ўраджаю. На Вялікдзень таксама наладжвалі ігрышчы. Моладзь у гэты

дзень гушкалася на арэлях, што ўсведамлялася як важнае магічнае дзеянне: пад'ём, узлёт на арэлях угору павінен быў, на думку людзей, стымуляваць рост расліннасці, пасеваў, дапамагчы ім хутчэй падняцца.

Лічылася, што на Вялікдзень пачынае кукаваць зязюля.

## Гульня ”Качанне яек“

**Мэта**: удасканальваць навыкі качання мяча на дошцы; развіваць хуткасць рэакцыі, трапнасць, вакамер; выхоўваць пачуццё радасці за поспех таварышаў.




**Абсталяванне:** яйкі (рознакаляровыя маленькія мячыкі), дошчачка.

**Апісанне гульні:** Для качання яек на роўным месцы пад схіл ставіцца лубок або невялікая дошчачка, і кожны па чарзе пускае па ёй яйка. Той, чыё яйка дакранецца да чужога, выйграе.

## Гульня ”Яйка пад шапкай“

**Мэта**: развіваць увагу, кемлівасць; выхоўваць сумленнасць, цікавасць да народных гульняў.

**Абсталяванне:** шапка, галінка вярбы, яйкі (маленькія мячыкі) для ўсіх удзельнікаў.

**Апісанне гульні:** Адзін з удзельнікаў гульні бярэ яйка і кладзе яго пад шапку. другі - павінен адгадаць, дзе менавіта схавана яйка. Ён кладзе паверх шапкі галінку вярбы і размяшчае яе ў тым накірунку, у якім, на яго думку, пад шапкаю ляжыць яйка. Калі галінка будзе размешчана правільна, значыць. загадка адгадана, і той, хто адгадаў, атрымлівае яйка. У адваротным выпадку ён аддае сваё.

# Юр'е

Юр'еў дзень выпадае на 6 мая. Даўняе гэта земляробчае свята першага выгану кароў. Юрый – апякун жывёлы і земляробства.Усе зімовыя запасы скаціна з'ела, засталося трохі дацягнуць да першай травы. ”Да Юр'я кармі дурня, а пасля Юр'я сам пракормішся“. У гэты дзень коням стрыглі хвасты і грывы. Хадзілі аглядаць палі, насілі на рунь каравай. Качаліся па ніве, каб зямля радзіла і давала здароўе. У зямлю нічога не закопвалі. На мяжу клалі кавалак булкі і гаварылі: ”Каб Бог даў высока жыта, да спяклі булку, да смачная была…“. Гэты абрад рабілі старыя замужнія жанчыны, а не

маладыя. Запальвалі свечку і прасілі: ”Святы Юрый, зберажы маю жывёлу ад звяроў і злодзеяў, вярні яе цэлай і здаровай“. Спявалі юр’еўскія песні.

З успамінаў Варанковай Н.П.: *”Статак на пашу выганялі вербнай галінкай, асвячонай у царкве ў вербную нядзелю. Вечарам гэтую галінку ўтыкамі пад страху. Шапталі замовы, абкурвалі кароў купальскімі зёлкамі, каб ніякое ліха не здарылася з каровай ці канём. Быў яшчэ абрад - ”замочванне“ даёнкі“, г.зн. раніцою жанчыны мылі даёнкі ”юраўскай“ расой. У першы дзень кароў пасвілі ўсёй вёскай. На наступны дзень пачыналі пасвіць па чарзе. Калі выганялі кароў, запальвалі спецыяльныя асвячоныя свечкі-грамніцы“.*

## Гульня ”Высокі дуб“

**Мэта**: развіваць увагу, спрытнасць, трапнасць, дакладнасць руху, цікавасць да народных гульняў.

**Абсталяванне:** палка, дошчачка, кароткая палачка, жалуды або сасновыя шышкі.

**Апісанне гульні:** Гульня праводзіцца на адкрытай пляцоўцы. Удзельнічаюць 4-8 чалавек. У поперак вузкай ямкі ўкладваюць кароткую палачку, на якую кладуць дошчачку. Затым па чарзе кожны ігрок кладзе жолуд на апушчаны канец дошчачкі, ударае па ім палкай і, калі жолуд падлятае ўверх, ловіць яго. Перамагае той, хто больш за ўсіх зловіць жалудоў.

## Гульня ”Гуж“

**Мэта**: развіваць хуткасць, спрытнасць.

**Абсталяванне:** не патрабуецца

**Апісанне гульні:** Двое гуляючых становяцца ў круг, астатнія – па заім. Адзін з ігракоў што стаіць у крузе, штурхае другога ад сябе са словам ”гуж“, той выбягае з круга і пачынае лавіць астатніх. Усе ўцякаюць. Калі ”гуж“ каго-небудзь зловіць, той ідзе ў круг і замяняе лаўца.

Правілы гульні: 1. Па сігналу ”гуж“ гуляючыя ўцякаюць, а ігрок- ”гуж“ ловіць іх. 2. Калі на працягу 3 хвілін ”гуж“ нікога не зловіць, на дапамогу яму прыходзіць ігрок, які застаўся ў крузе.

## Гульня ”Маялка“

**Мэта**: развіваць хуткасць, спрытнасць.

**Абсталяванне:** валейбольны мяч.

**Апісанне гульні:** Гуляць можна на адкрытай пляцоўцы. Удзельнічаюць 7-15 чалавек.



Іграки выбіраюць вядучага, чэрцяць на зямлі круг дыяметрам 4-5 метраў і каля 4-5 метраў ад яго – паўкруг дыяметрам 6-8 метраў. Затым усе, акрамя вядучага, размяшчаюцца на лініі паўкруга.

Вядучы кідае ўгору над кругам мяч і хутка выклікае аднаго з гуляючых. Той павінен падбегчы да груга, злавіць мяч і вярнуць вядучаму. Калі не зловіць – выбывае з гульні.

# Саракі

Прысвятак Саракі адзначаецца 22 сакавіка. Назва дня паходзіць ад Сарока Севасційскіх пакутнікаў. Вернікі ў гэты дзень абавязкова хадзілі ў царкву, і ў памяць аб пакутніках ставялі сорак свечак. У гэты дзень песня жаваранкаў нагадвае малітву Севасційскіх пакутнікаў Богу. Трэба было абавязкова пачаставаць вестуноў вясны, якія прагналі зіму.

На Шумілinшчыне, як і па ўсёй Беларусі, вядома павер'е, што на Саракі з цёплых краін на нашу старонку вылятае сорак выраяў птушак.

З успамінаў Вераб'ёвай Ніны Пятроўны: *"Напярэдадні свята ў нашай сям'і выпякалі пячэнне ў выглядзе птушак, якіх называлі "жаваронкі". У адну з іх абавязкова запякала манетку. Той, каму даставалася "птушачка" з манеткай, будзе шчаслівы на працягу года. Манетку-талісман захоўвалі за бажніцай у чырвоным вугле. Пяклі "жаваронкаў" з поснага цеста. Па надвор'ю 22 сакавіка вызначалі надвор'е на сорак дзён наперад. З гэтага дня пачыналіся ранішнія замаразкі. Іх абавязкова будзе сорак, але адзін мякчэй другога".*

У гэты дзень абавязкова трэба было пачаставаць жабракоў, убогіх. Не забывалі пачаставаць і хатную скаціну, каб яна не хварэла. З гэтымі "жаваронкамі" хадзілі гукаць вясну. Іх падкідвалі ўгару, каб паскорыць прылёт птушак. Моладзь гушкала на арэлях.

Па народным календары, у гэты дзень зіма канчаецца - вясна пачынаецца, дзень з ноччу мераецца-раўняецца. Калі верыць народнымі прыкметамі,

*Прыказкі, прымаўкі, прыкметы, павер'і:*

На Саракі пайшла зіма да ракі.

На Саракі ў адзін дзень сорак нядзель.

На Саракі ў адзін дзень сорак марозаў.

На Саракі прылятае сорак выраяў.

На Саракі ўбачыў шпака – вясна ля ганка.

Грэчку сеюць праз сорак дзён пасля Сарака.

Калі ад Грамніц да Сарака трымаецца добрае, сухое надвор’е, то летам чакаецца засуха.

Сарока пачынае віць сабе гняздо і прыносіць для гэтага сорак пруцікаў.

Лічаць на шчасце праталіны: калі налічыць да сарака, то па вясне гора не зазнаеш.

Таксама ў Сарокі не рэкамендуецца шыць, рамантаваць нешта, а таксама пазычаць грошы, злавацца і сварыцца.

На Шумілiншчыне гэта свята не адзначаецца. Толькі ў асобных установах адукацыі ладзяць гэта свята. У Шумілінскім РЦДіМ гэтае свята адзначаецца ўжо тры гады запар.

## План правядзення свята ”Саракі“

| Назва мерапрыемства | Адказныя |
|---|---|
| Выраб шпакоўняў ”Дом для птушак“ | аб’яднанні па інтарэсах ”Wood майстар“, ”Свет творчасці“ |
| Казачная сцэнка ”Веснавыя клопаты“ | Аб’яднанне па інтарэсах ”Тэатральныя ступенькі“ |
| Конкурс вершаў і песень ”Птушынае царства“ | Педагогі дадатковай адукацыі |
| Віктарына ”Казкі і птушкі“ | Педагогі дадатковай адукацыі |
| Конкурс малюнкаў ”Птушыны вырай“ | Педагогі дадатковай адукацыі |
| Майстар-класы | Педагогі дадатковай адукацыі |
| Выстава дзіцячай творчасці ”Птушкі роднага краю“ | Педагогі дадатковай адукацыі |
| Літаратурнае падарожжа ў краіну птушак | Збор скараговорак, прымавак, праказак, выслоўяў пра птушак |

## Гульня ”Гусі ляцяць!“

**Мэта:** Садзейнічаць развіццю ўвагі, каардынацыі рухаў, кемлівасці.

**Апісанне гульні:**

Гуляючыя выбіраюць вядучага, а самі становяцца ў шарэнгу. Вядучы падае каманды: “Гусі ляцяць!”, затым: “Качкі ляцяць!”, “Вароны ляцяць!”, “Шпакі ляцяць!” і г.д. ігракі падымаюць рукі ўгору і махаюць імі, нібы птушкі крыламі, пры гэтым гучна гавораць: “Ляцяць!”. Потым хутка апускаюць рукі. Час ад часу вядучы спрабуе заблытаць ігракоў, кажучы: “Карасі ляцяць!”, “Зайцы ляцяць!”. Гуляючыямогуць дапусціць памылкі і памахаць крыламі. Той з ігракоў, хто памыліўся, атрымлівае штрафное ачко. Перамагае той ігрок, які ні разу не памыліўся. Праз пэўны час (по дамоўленнасці) гуляючыя мяняюць вядучага.

## Гульня ”Арол“

**Месца правядзення:** пляцоўка, зала.

**Інвентар:** валейбольны мяч.

**Мэта:** садзейнічаць развіццю хуткасці, спрыту.

**Апісанне гульні:** Іракі - ”паляўнічыя“ з дапамогай жараб’ёўкі выбіраюць вядучага - ”арла“, а самі адвольна перамяшчаюцца па пляцоўцы, перакідваюць адзн аднаму мячык, стараючыся выбраць зручны момант і лёгка ўдарыць мячом у спіну ці па нанах ”арла“. Але падыходзіць да ”арла“ бліжэй як на пяць-шэсць крокаў не дасваляецца. Калі ”арол“ набліжаецца да ”апаляўнічага“, які трымае мяч, той уцякае альбо аддае мяч іншаму. Калі ”арол“ зловіць мяч на ляту, ён закідвае яго за межы пляцоўкі. Вяртае мяч у гульню ”паляўнічы“, па віне якога мяч быў злоўлены ”арлом“.

”Паляўнічы“, якому ўдасца падбіць ”арла“, мяняецца з ім ролямі.

## Праздник народного календаря ”Сороки“

*Романова Светлана Юрьевна,*
*культорганизатор*

**Цель**: ознакомление детей с народным праздником ”Сороки“ (”Жаворонки“).

**Задачи:**

познакомить учащихся с историей весенних праздников.

расширять кругозор детей о жизни, традициях и праздниках родного народа

воспитывать у учащихся нравственные ценности, уважение к традициям своей Родины, её культурному наследию.

### Ход праздника

**Ведущая 1:** Добрый день, ребята, сегодня мы с вами познакомимся с праздником народного календаря ”Сороки“ или ”Жаворонки“.

**Ведущая 2:** Этот праздник имеет свой интересный смысл, свою историю и свои обычаи. Считалось, что именно во время весеннего равноденствия прилетают из теплых стран жаворонки, а за ними и все перелетные птицы. Именно 22 марта весна окончательно сменяла зиму, а день мерялся с ночью. И это событие означало, что можно начинать полевые и другие хозяйственные работы. Сами люди связывали прилет жаворонков с началом пахотных работ, говоря: ”Жаворонок небо пашет“.

**Ведущая 1:** Праздник Жаворонки назывался еще и ”Сороками“. Название ”Сороки“ в честь сорока мучеников Севастийских. Это были

воины-христиане, которые приняли мученическую казнь за веру, память их празднуется 22 марта. Жаворонки к воинам никакого отношения не имели, но число сорок прочно приросло к празднику. Эти сорок мучеников были казнены за веру, благодаря чему вошли в историю. В народе даже говорили: ”Жаворонок за собой сорок птиц привел“.

**Ведущая 2:** Праздник Жаворонки сопровождался и различными погодными приметами. Если после праздника еще 40 дней по утрам будет морозно – можно ждать жаркого лета. Если гнезда вились на солнечной стороне – можно было ожидать холодное лето.

**Ведущая 1:** Главным атрибутом праздника Жаворонки считалась выпечка булочек из пресного теста в виде жаворонков. Пекли во всех домах фигурки птиц с распахнутыми крылышками, глазками-изюминками, обсыпанные сахаром. Выпечка эта называлась по-разному: ”грачами“, ”птюшками“, ”чувильками“, ”куликами“, но чаще – ”жаворонками“. Именно жаворонки, по народному представлению, должны были принести на своих крыльях долгожданную весну.

**Ведущая 2:** Все члены семьи получали такую птичку – румяную, хрустящую, аппетитную, но не съедали сразу, а принимались кликать весну, кто во что горазд. Забирались на крыши, подбрасывали птичек вверх и старались петь-кричать погроме, чтобы Весна услышала.

Мальчишки ватагой бегали по улице с этими птахами в руках, подбрасывали их вверх, ловили с громкими криками, чтобы настоящие птицы поторапливались: подобное к подобному. Их называли детьми или братьями перелетных птиц, их рассаживали на проталинах, крышах, деревьях и стогах. При этом пелась закличка: ”Жаворонок, жаворонок, вот твой брат! “

**Ведущая 1:** В жаворонков запекали разные маленькие вещички, чтобы по ним гадать. Кому кольцо достанется – тот женится или замуж выйдет, кому копейка – тот в этом году хорошо заработает, кому маленькая тряпочка, узелком завязанная, – у того ребенок родится.

**Ведущая 2:** Однако кроме хороших примет, нужно было обязательно слепить жаворонков и с грустными предсказаниями, и жаворонков пустых – иначе хорошие не сбывались. Конечно, хозяйки по-своему хитрили и ”несчастливых“ птиц отдавали детишкам со строгим наказом – не есть, а оставить на шесте в поле.

Печеных птах посылали родным и близким, чтобы весна, свет и тепло пришли и к ним. До чего же разнообразными были эти выпечки!

**Ведущая 1:** Ребята мы предлагаем вам вместе с нами слепить птичек из теста.

*Мастер-класс ”Жаворонок из теста“*

**Ведущая 2:** Пока наши птички будут выпекаться, мы с вами будем дальше знакомиться с обычаями праздника.

**Ведущая 1:** Очень часто за событиями и за сутолокой дней
Старины своей не помним, забываем мы о ней.

В каждом селе, в каждой деревне в старину были свои обычаи посиделок, праздников, посвященных народному календарю.

**Ведущая 2:** Собиралась молодежь, чтобы себя показать и других посмотреть. По народному календарю первый месяц весны богат праздниками. И мы сегодня празднуем День встречи весны — ”Жаворонки“.

**Ведущая 1:** Давайте золотые ворота для Весны-красны открывать. Это поможет весне силу удвоить, а зиму победить. Но хоть ”зима весну пугает, да сама тает“, пусть весной часто бывают холода, но весна все равно победит, и мы ей в этом поможем.

**Ведущая 2:** А сейчас мы приглашаем вас принять участие в народной игре ”Золотые ворота“.

*Ведущие встают друг напротив друга, берутся за руки и поднимают их вверх, образуя ”ворота“.*

**Ведущая 1:** Ребята, теперь встаньте цепочкой, возьмитесь за руки *(Дети берутся за руки или кладут руки на плечи друг к другу)*

**Ведущая 2:** Сейчас мы начнем читать стих, а вы змейкой должны двигаться, проходя под ”воротами“. Цепочку разрывать нельзя!

Золотые ворота
Пропускают не всегда.
Первый раз прощается,
Второй - запрещается.
А на третий раз
Не пропустим вас!

Когда зазвучит последняя фраза ”ворота закроются“ - и мы поймаем тех участников, которые оказались внутри ”ворот“. Тех, кого мы поймаем, тоже становятся ”воротами“. Задание понятно? *(Ответы детей)*

**Ведущая 1:**

В народе так говорили об этом дне:
Когда вода разольётся,
Когда лес зазелениться,
Когда птицы прилетают,
Тогда и весна приходит.

**Ведущая 2:** А, скажите-ка, мне ребята, какие вы знаете приметы весны? *(Ответы детей)*

**Дети:** Удлиняется день, тает снег, набухают почки, прилетают птицы из тёплых краёв.

**Ведущая 1:** В старину весну люди очень ждали, пели для неё песни-веснянки, чтобы она поторопилась, чтобы птицы поскорее с юга вернулись.

Давайте и мы с вами вспомним весенние заклички. Красны девицы да добры молодцы, в хоровод вставайте, Веснушку-весну зазывайте!
*Дети произносят заклички про весну.*
**Дети:**
Весна, весна красная!
Приди, весна, с радостью,
Приди, весна, с милостью!
Весна, весна красная!
Приди, весна, с радостью,
С радостью великою,
С милостью богатою.
Со льном высоким,
С корнем глубоким,
С корнем глубоким,
С хлебом обильным.

**Ведущая 2:** Не может весна без солнышка прийти, пора его звать - закликать.

*Дети вместе с ведущей повторяют закличку*

Солнышко, солнышко, красное ведрышко,
Высоко взойди, далеко посвети!
На темные лесочки, на сырые борочки,
На речку, на поля, на синие моря,
На зеленый огород и на весь народ!

*звучит пение птиц.*

**Ведущая 1:** А вот и солнышко проснулось, засияло, улыбнулось. Птицы весело поют, Весну-красну на крыльях несут.

Солнышко согрело землю, растаял снег, всюду побежали журчащие ручейки. А сейчас мы с вами поиграем в старинную игру, которая символизировала таяние снега. Встаньте парами мальчик и девочка, возьмитесь за руки и поднимите их вверх, чтобы получился ручеёк.

*Дети образуют ручеек. Под музыку 1 ведущая входит в ручеёк и берёт себе пару.*

**Ведущая 2:** Кто остался один, тот и водит, выбирая себе кого захочет. Так и бежит ручеёк вперёд и вперёд. И вместе с этим бегом приближается Весна.

*Хоровод-игра ”Ручеёк“*

*По окончании игры звучит фонограмма щебетания птиц. Весна входит с коромыслом, на котором одно ведро тёмное, второе светлое – в нём лежат фигурки птичек из бумаги.*

**Весна:**
Я раскрываю почки в зелёные листочки,
Поля вновь засеваю, деревья одеваю.

Движением полна. Зовут меня Весна!

**Ведущая 1:** Вёснушка-весна! Снега ты растопила, бегут ручьи, солнце светит ярче.

**Ведущая 2:** Ребята, а кто ещё нам возвещает о приходе весны? *(Ответы детей)*

**Дети:** Птицы!

**Ведущая 2:** Да, первые вестники весны – птицы. В старину люди верили, что именно с прилетом птиц наступает весна. Говорят пословицы: ”Как птицы прилетят, так и теплота пойдет! “, ”Птица радуется весне, а младенец матери“. Кто же эти вестники весны? Ответить на этот вопрос вам помогут загадки.

**Ведущая 1:** Угадайте, что за птичка -
Темненькая невеличка.
Беленькая с живота,
Хвост раздвинут в два хвоста. *(Ласточка)*

**Ведущая 2:** Всех перелетных птиц черней,
В пашне ищет он червей,
Взад-вперед по пашне вскачь,
А зовется птица… *(Грач)*

**Ведущая 1:** В лесу ночном горюет птица,
Она назвать себя боится.
– Ку-ку… Ку-ку…
Не спит опушка,
А птицу эту звать… *(Кукушка)*

**Ведущая 2:** Мы построили вдвоем
Для гостей весенних дом,
А верней сказать – дворец.
Прилетай сюда… *(Скворец)*

**Ведущая 1:** Он летает, как стрела,
Раз – и нет его, друзья.
Очень он похож на ”чиж“,
Но зовут его все … *(Стриж)*

**Ведущая 2:** Гнездо свое он в поле вьет, где тянутся растения.
Его и песни, и полет вошли в стихотворение. *(Жаворонок)*

**Весна:** Разных птиц я люблю, разных птиц приголублю, но дороже всех одна пташка малая. Кто она, вы знаете? Скорей мне ответьте! *(Ответы детей)*

**Дети:** Это жаворонок.

**Весна:** Правильно. А вы знаете почему? *(Ответы детей)*

**Ведущая 1:** Жаворонки – это певчие птицы, которые первые прилетают с юга, птицы, которые выше всех остальных птиц поднимаются

в воздухе и ближе всех бывают к солнцу и своими звонкими трелями возвещают о приходе весны.

Жаворонки внешне неприметны: серые с темными пестринками, с маленькой круглой головкой, небольшим хвостиком.

Люди пекли из теста жаворонков, выходили с ними на гулянья, зазывали, кликали весну.

**Ведущая 2:** А ну, ребятки, вставайте, с жаворонком поиграйте!

*Игра ”Жаворонок“*

*Дети стоят в кругу, ведущая (жаворонок) ходит за кругом с колокольчиком, проговаривая слова:*

В небе жаворонок пел, колокольчиком звенел,
Порезвился в тишине, спрятал песенку в траве,
Тот, кто песенку найдет, будет счастлив целый год.

*Дети закрывают глаза, водящий прячет колокольчик за ребенком, нашедший звонит в колокольчик, затем происходит смена ведущего.*

**Ведущая 1:** Весна идет, торопится. Встречали Веснушку-Весну в праздник ”Благовещение“. На Благовещение, говорят, весна зиму поборола. А ещё говорили: ”Благовещение – птиц отпущение“. Отпускали в этот день всех птиц на волю. Выпуская птиц приговаривали:

Синички-сестрички,
Тетки-чечетки,
Краснозобые снегирюшки,
Щеглята-молодцы,
Воры воробьи!
Вы по воле полетайте,
Вы на вольной поживите,
К нам весну скорей ведите!

Ребята, вставайте в хоровод и исполним песню ”Ой, бежит ручьем вода“ .

**Ведущая 2:** Весна-красна, а что это у тебя за коромысло?

**Весна:** Коромысло не простое. Видите, на нём два волшебных ведёрка? В одном, тёмном, тёмная ночь живёт. В другом, светлом, ясный день.

**Ведущая 2:** Ой, как интересно. А какое из них легче, а какое тяжелее?

**Весна:** Сейчас оба ведра по весу сравнялись. Ведь сегодня день весеннего равноденствия, день равен ночи. А дальше светлое ведро всё тяжелее становиться будет, потому что день расти начинает.

**Ведущая 1:** В этот день в каждом доме лепили из теста птичек, жаворонков, пекли их, мазали сладким и душистым медом. Мальчишки бегали по улицам с этими птахами, подбрасывали их вверх, ловили и громко кричали заклички.

**Ведущая 2:** Жаворонки, жавороночки! Вы скорее летите, тепло принесите.
Нам зима надоела - весь хлеб она поела.
Нет ни хлеба, ни картошки, самовар стоит на окошке.

**Ведущая 1:** Наши жаворонки испеклись, мы их сами лепили, весну приближали. С пылу, с жару!

*Ведущая раздает угощение, приговаривая:*

Жаворонки прилетели,
На головку деткам сели.
Хоть птицы к нам возвращаются,
А до тепла еще далеко –
40 мучеников,
40 утренников,
40 заморозков.

**Ведущая 2:** Не забудьте, ребята, дома птичек тоже угостить - насыпать им корма в кормушки.

**Ведущая 1:** Мы встретились с Весною,
О ней мы все узнали.

**Ведущая 2:** Хотим, чтоб о весне прекрасной
Родным вы дома рассказали!

**Все вместе:** До свидания! До новых встреч!

*Звучит народная мелодия.*






*Пад час правядзення свята ”Саракі“. Шумілінскі РЦДіМ*

# Майстар-клас ”Птушка з рагозу“

*Каласкова Таццяна Пятроўна,*
*педагог дадатковай адукацыі*

**Мэта:** выраб дэкаратыўнай птушкі з рагозу.

**Задачы:**

пашыраць прадстаўленне дзяцей аб разнастайнасці прыродных матэрыялаў;

развіваць творчыя здольнасці вучняў, цікавасць да роднай прыроды, навыкі самакантролю ў працы, камунікатыўныя здольнасці;

выхоўваць цікавасць да народных вытокаў дэкаратыўна-прыкладнай творчасці, працавітасць, пачуццё ўзаемадапамогі.

**Абсталяванне:** лісце рагозу, нажніцы, ніткі.

## Ход майстар-класа

### І. Тэарэтычная частка.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва жыве ўжо шмат стагоддзяў. І самым старажытным з рамёстваў лічыцца пляценне. Яно нарадзілася ў той добры час, калі яшчэ не было супермаркетаў і машын, а чалавеку, каб забяспечыць сябе і блізкіх, даводзілася вельмі шмат працаваць рукамі. Кожны тады быў сваёй справы майстар. На шчасце, многія іх працы захаваліся да нашага часу, і на прыкладзе мы сёння спазнаём прыгажосць і гармонію.

Можа быць, у вас дома яшчэ захоўваюцца тыя прадметы, якія зрабілі сваімі рукамі вашы бабулі і дзядулі? (Адказы ўдзельнікаў майстар-класа).

Для пляцення на Беларусі выкарыстоўваліся такія расліны як рагоз, чарот, сітнік, аер, лаза. Усе гэтыя расліны, любяць сяліцца на вільготных месцах, па берагах вадаёмаў і ў саміх вадаёмах, гарэлых тарфяніках, у закінутых кар’ерах, часта утвараючы шырокія зараснікі, якія распаўсюджаны на тэрыторыі нашай краіны паўсюдна.

Рагоз - гэта шматгадовая расліна, вышынёй да 4 м. з доўгім зялёным лісцем і шчыльным цыліндрычным суквеццем карычневага колеру. Нарыхтоўваюць травы для пляцення толькі пасля таго, як яны стануць гнуткімі, набяруць сілу. Гэта бывае звычайна ў перыяд цвіцення раслін, бліжэй да сярэдзіны лета. Расліны зразаюць сярпом або вялікім нажом. Травы сушаць, падвешваючы пучкамі або укладваючы тонкім пластом на гарышчы, сенавале або ў цяні пад падстрэшкам. Летам, асабліва ў гарачыя дні, травы сохнуць вельмі хутка, а каб яны сохлі больш раўнамерна, іх варошуць некалькі разоў на працягу дня. Дастаткова аднаго-двух дзён, каб атрымаць прыдатны для працы матэрыял. Высушанае лісце рагозу захоўваюць натуральную зялёную афарбоўку. Трава ж, якая пабывала на сонца, выгарае і набывае залацістае адценне. Гэтую розніцу ў афарбоўцы

траў выкарыстоўваюць у дэкаратыўных мэтах пры камбінаваным пляценні. Але паколькі высушаныя на сонца травы меней трывалыя і пазбаўлены эластычнасці, іх ужываюць вельмі асцярожна толькі для аддзелачных работ. Захоўваць травы зручней за ўсё на гарышчы, у цёмным памяшканні, якое праветрываецца. Толькі перад тым, як разлажыць траву на захоўванне, яе трэба звязаць у невялікія пучкі, прычым абавязкова джгутамі, скручанымі з той жа самай травы. Карані рагозу ўжывалі ў ежу: іх варылі, рабілі з іх муку, пяклі хлеб і кашу.

**II. Практычная праца.**

А цяпер прыступаем да працы. Праверце сваё працоўнае месца. У вас на стале павінна ляжаць усё неабходнае: нажніцы, ніткі, рагоз.

Этапы вырабу птушачкі:

1. Замочыце рагоз у вадзе хвілін на 10-30 хвілін і загарніце яго ў вільготную шчыльную тканіну на 2-3 гадзіны.

2. Пратрыце анучкай сцеблы рагозу, каб выдаліць лішкі паветра і вады.

3. Сагніце сцябло рагозу напалову і разрэжце нажніцамі на дзве роўныя часткі.

4. Вазьміце адзін лісцік і падхініце край унутар, сцісніце. Потым рабіце перацяжку пасярэдзіне, некалькі разоў абматывая нітачкай і канцы завяжыце на два вузельчыка.



5. Сагніце ліст на месцы перацяжкі.

6. Адвольна скатываем з мяккага маленькага рагозу круглы камячок і ўкладваем у адну з палавінак у цэнтральнай перацяжкі.

7. Цяпер робім наступную перацяжку, пазначаючы шыю, аддзяляючы галаву ад асноўнага тулава будучай птушачкі.



8. Робім крыльцы: бярэм другі ліст рагозу, разразаем яго на дзве часткі, складаем яго адзін на другі і перацягваем пасярэдзіне.



9. Кладзем крыльцы паміж двума лісцікамі асноўнай часткі і перавязваем крыж на крыж, замацоўваючы вузламі.

10. Хвосцік падзяляем на 4 часткі.



11. А далей працуем пляценнем вяровачка. Перацяжка і перапляценні могуць быць выкананы з каляровых нітак.

**Заключная частка. Рэфлексія**

Давайце з вамі сплетём ”каравай настрою“ нашай сумеснай працы. Удзельнікам выдаюцца кавалачкі ”каравая“, на абароце якіх трэба напісаць свае ўражанні ад майстар-класа.

## Майстар-клас ”Падвясныя саламяныя птушкі“

*Каласкова Таццяна Пятроўна,*
*педагог дадатковай адукацыі*

**Мэта:** выраб падвясной саламянай птушкі.

**Задачы:**

асвоіць асноўныя этапы вырабу падвясной саламянай птушкі;
стварыць умовы для прадуктыўнага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва;
выхоўваць беражлівыя адносіны да птушак ў розныя поры года.

**Абсталяванне:** саломка, ніткі, нажніцы.

**Ход майстар-класа**

**Тэарэтычная частка.**

У кабіне гучыць музыка, незвычайная музыка. Хто з вас пазнаў яе.

(Адказы). Правільна. Вы чуеце ў запісу птушыныя галасы. Паспрабуйце здагадацца, якая птушка так ”спявае“. Пад гэтую ”цудоўную музыку“ мы в вамі і будзем рабіць саламяную птушачку.

З саломы можна зрабіць цацкі і дэкаратыўныя скульптуры ў выглядзе птушак. Іх звязваюць з некалькіх пучкоў ці збіраюць з асобных плеценых дэталяў. У залежнасці ад канструкцыі саламяныя птушкі могуць быць падвяснымі, стаячымі на двух нагах або на адной назе-падстаўцы.

Найбольш простыя ў вырабе падвясныя птушачкі. Іх выразная форма дыктуецца рацыянальнымі канструктыўнымі прыёмамі, выпрацаванымі народным мастацтвам. Падвясныя саламяныя птушкі - лёгкія, лунаюць у паветры, няспынна верцяцца і мігцяць залацістым бляскам вырабы. Яны вельмі прыгожыя.

Выкананне птушак на падстаўках патрабуе прымянення больш складаных канструктыўных і дэкаратыўных прыёмаў. Каб зрабіць дэкаратыўную саламяную птушку вялікага памеру, неабходна валодаць разнастайнымі спосабамі пляцення, тэхнічным майстэрствам і развітым пачуццём пластычнай формы.

У народным саломапляценні існуюць багатыя традыцыі стварэння падвясных птушак з саломкі, разнастайных па канструкцыях і варыянтах дэкаратыўнага афармлення. Саламяныя птушачкі падвешваюцца за нітку. Каб птушка вісела роўна, трэба пры яе вырабе разлічыць цэнтр цяжару так, каб ён прыходзіўся якраз на перавязку на месца злучэння хваста і крылаў.

**Практычная частка.**

## Галубок

Найбольш простая ў вырабе традыцыйная для беларускага народнага мастацтва падвясная птушка - галубок. Яна выконваецца ў тэхніцы прамога пляцення.

Птушка будзе больш прыгожая, калі свабодныя саломіны крылаў пераплесці паміж сабой па-над тулавам.

20-30 доўгіх саломін або саламяных стужак пераплесці паміж сабой у квадрат або прамавугольнік па прынцыпе прамога пляцення, канцы пакінуць незаплеценымі.





Саломіны з бакоў 1 і 2 звязаць у пучкі - атрымаецца плеценае тулава, шыя і хвост птушкі. Пучок для шыі адхіліць уверх, абвіць саламянай стужкай і зрабіць перавязку на месцы галавы.



Каб зрабіць крылы, трэба звязаць у пучкі саломіны з бакоў 3 і 4, перакласці іх так, каб яны памяняліся месцамі, і замацаваць разам перавязкай.



## Падвясная птушка з двух пучкоў саломы

### Першы варыянт

Падвясную саламяную птушачку можна зрабіць яшчэ адным спосабам: звязаць з двух пучкоў саломы. З аднаго пучка вырабляеццаа галава, шыя, хвост, а з другога - крылы.



Пучок перавязаць з аднаго канца; дзве саломіны адвесці ад перавязкі ў бок і сагнуць для дзюбы (іх можна таксама пераплесці і скруціць).



Перавязкай намеціць шыю, а астатнюю частку пучка адхіліць для тулава і хваста.



Каб зрабіць крылы, трэба ўзяць другі пучок саломы і перавязаць яго па цэнтры. Потым падзяліць асноўны пучок-тулава на дзве часткі і закласці паміж імі пучок-крылы.



Замацаваць крылы перавязкай асноўнага пучка. На крылах, хвасце, чубку канцы саломін падстрыгчы.

### Другі варыянт

Гэты варыянт адрозніваецца ад папярэдняга іншым спосабам замацавання крылаў.



Галаву і шыю птушкі звязаць па папярэдняй схеме. Крылы зрабіць з двух пучкоў саломы. Для першага крыла ўзяць адзін пучок і адну яго палову абкласці да хваста, а другую абгарнуць вакол шыі і адвесці ў бок.



Другое крыло выканаць аналагічным чынам, але ў адваротным накірунку. Адзін канец пучка абкласці па-над хвастом і першага крыла, затым абгарнуць вакол шыі і адвесці ў процілеглы ад другога крыла бок.

## Маршрутная карта ”Стаячая птушка“

### Саламяная птушка на дзвюх нагах з апорай на хвост

Дэкаратыўных саламяных птушак можна зрабіць стаячымі на двух нагах або на назе-падстаўцы.



Пасля таго, як звязаны галава, шыя птушкі, астатнюю частку пучка падзяліць на дзве часткі для ног.



Пучкі-ногі перавязаць і роўна падстрыгчы. Для хваста ўзяць асобны пучок саломы, перагнуць яго пасярэдзіне і пакласці па-над перавязкай ў месцы раз’яднання шыі і ног.

Часткі пучка-хваста злучыць за шыяй птушкі і звязаць.



## Саламяная птушка на аднойназе-падстаўцы

Выконваецца па прынцыпе падвяснай птушкі з двух пучкоў саломы.



Спачатку звязаць галаву і шыю птушкі. Для крылаў ўзяць асобны пучок. Абгарнуць яго вакол шыі птушкі так, каб канцы перахрысціліся і разышліся ў розныя бакі.





Узяць невялікі пучок саломы. Перакінуць яго паверх крылаў і хваста і звязаць пад імі. Для ўстойлівасці падстаўкі канцы саломін падстрыгчы, адхіліць іх ад сярэдзіны пучка, развесці па кругу і зафіксаваць ў такім

становішчы да высыхання саломы. Птушка будзе больш устойлівая, калі да падстаўкі знізу падклеіць картонны кружок.

**Заключная частка. Рэфлексія.**

Сёння вы пазнаёміліся з асновамі пляцення птушкі. Спадзяюся, што наш майстар-клас не прайшоў дарма. А цяпер прапаную вам выбраць з гэтых прыгожых птушак тую, якая адпавядае вашаму настрою.

## Майстар-клас ”Драўляная цацка ”Салавей“

*Пціцкі Аляксандр Яўгенавіч,*
*педагог дадатковай адукацыі*

**Мэта:** выраб аб’ёмнай драўлянай цацкі ”Салавей“.

**Задачы:**

навучыць паслядоўнасці вырабу аб’ёмнай драўлянай цацкі ”Салавей“;

спрыяць фарміраванню ў дзяцей нацыянальнай самасвядомасці, пазітыўнага стаўлення да традыцый свайго народа.

**Матэрыялы майстар-класа:** драўніна, фрэза-вушка, падкладка з ДВП, шаблоны, наждачная папера, ручной лобзік па дрэве, клей ПВА.

**Ход майстар-класа**

**Тэарэтычная частка**

Цацкі заўсёды былі важнай часткай дзяцінства з спрадвечных часоў. Дакладная дата з’яўлення дзіцячых драўляных цацак сёння невядома. Невядома і тое, з якога матэрыялу была выраблена першая дзіцячая цацка. У старажытнасці дзіцячыя цацкі ў выглядзе фігурак рабілі з каменя і косці, якія ўяўлялі сабой фігуркі жывёл. У мінулым драўляныя цацкі не заўсёды прызначаліся для дзяцей. Часта драўляныя фігуркі выкарыстоўваліся ў розных абрадах і рытуалах, ім прыпісвалася сувязь з замагільным светам. У Шумілінскім раёне чалавечая фігурка лічылася абярэгам ад злых духаў, а лялька, падораная маладым падчас вясельнага абраду, была абаронцай сямейнага ачага. Як правіла, такія лялькі вырабляліся з дрэва.

Кожны народ ствараў свае цацкі, перадаючы ў іх свой светапогляд. У якасці сыравіны для драўлянай цацкі часцей за ўсё выбіраліся асіна, бяроза, ліпа, хвоя або бук. Цацкі, якія складаюцца з некалькіх узаемазвязаных частак, рабілі з дошак, але сустракаліся яны радзей. Як правіла, у працы над цацкамі майстры выкарыстоўвалі сякеру і нож, часам стамеску.

Драўляныя цацкі беларускіх майстроў не менш каштоўныя, чым гліняныя. Іх звычайна рабілі народныя майстры з імітацыяй рухаў або дзеянняў. Да такіх цацак адносяцца ”Кавалі“, ”Конікі“, ”Кураняты дзяўбуць зерне“ і іншыя. Пры вырабе цацак з дрэва народныя майстры звярталі ўвагу не на скульптурныя вырабы, а на тое, каб прыдумаць арыгінальны механізм, які ажывіць драўляную цацку. Тэхніка вырабу драўляных

народных цацак простая і даступная дзецям. Яна пабудавана на найпростых законах механікі. Народныя цацкі з дрэва, забаўляючы дзіцяці, адначасова знаёмяць яго з навакольным светам, працай дарослых (кавалі куюць жалеза). Поруч з такімі дынамічнымі цацкамі народныя майстры выраблялі з дрэва розныя драўляныя фігуркі, якія вешалі над дзіцячай калыскай, цацачную мэблю. Драўляныя цацкі ў большасці сваёй даволі простыя.

Праз народную цацку людзі перадаюць сваю любоў і пяшчота, сваю радасць і смех, свае думкі і веды. Аднолькава з народнай казкай, народнай песняй народная цацка спрыяе фарміраванню ў дзяцей нацыянальнай самасвядомасці, пазітыўнага стаўлення да традыцый свайго народа.

**Практычная частка.**

Складанне і замалёўка эскіза. Выразанне шаблону.



Падбор і падрыхтоўка матэрыялаў. Перанос эскіза на загатоўку з дапамогай шаблону з улікам эканоміі матэрыялу.



Выпілоўванне элементаў будучага вырабу з дапамогай ручнога лобзіка.





Наданне элементам акругласці, дэталізацыя элементаў наждачнай паперай і ручкай-разаком.



Аб’ёмная цацка гатова. Магчыма аздабленне акрылавым лакам, роспісам (па жаданні).

**Заключная частка. Рэфлексія.**

Калектыўнае абмеркаванне вынікаў майстар-класа.

## Маршрутная карта ”Птушка ”Лебедзь“

*Чупрукова Таццяна Віктараўна,*
*педагог дадатковай адукацыі*

**Мэта:** выраб аб’ёмнай цацкі з каляровай паперы.

**Задачы:**

навучыць прыёмам працы з паперай;
развіваць дробную маторыку рук;
выхаваць працавітасць, цікавасць да творчасці, эстэтычны густ.

**Матэрыялы:**

шаблоны для тулава, крылаў, круг для асновы;
каляровая і белая папера, просты аловак, нажніцы, клей.

**Паслядоўнасць вырабу**

1. Абводзім дэталі для лебедзя на белай паперы, круглую аснову - на блакітнай, з зялёнай паперы выразаем прамавугольнік для вырабу травы.



2. Крылы і траву наразаем махрамі. Махры на крылах падкручваць з дапамогай нажніц.



3. На дэталях для тулава лебедзя робім складкуу, як паказана на фота і склейваем.



4. Далей прыклейваем крылы, і самога лебедзя на аснову.



5. Разразаем траву на часткі, згібаем яе ў асновы, прыклейваем.



# Мастер-класс ”Пернатые друзья“

*Силкина Маргарита Альбертовна,*
*педагог дополнительного образования*

**Цель:** закрепить умение вышивки птицы.

**Задачи:**

активизировать познавательную деятельность учащихся;
закрепить основные приёмы вышивки;
прививать интерес к культуре и искусству;
развивать сенсорные и моторные навыки;
развивать устойчивый интерес к вышивке крестиком.

**Оборудование:** ткань Аида (конва), ножницы, нитки (мулине), иглы, пяльцы, схема вышивки.

**Ход мастер-класса**

**I. Теоретическая часть.**

Орнаментация ткани способом вышивки имела широкое развитие повсеместно на территории Шумилинского района в конце XIX и на протяжении всего XX веков. Вышивка являлась одним из основных технических приемов украшения одежды: женских и мужских рубах, женских головных уборов, передников. Ею орнаментировали также предметы быта – рушники, скатерти, подзорники, накидки на подушки, дорожки, салфетки, занавески.

Виды вышивки, характерные для нашего района – ”простой“ и ”болгарский крест“, ”гладь“, ”протяг“, ”перевить“. Из покон веков это ремесло было женским. Практическое обучение начиналось с детского возраста от матери к дочери. Это обусловило передачу творческих навыков от поколения к поколению.

Материалами для вышивки являлись льняные, реже шерстяные и хлопчатобумажные двухремизные домотканые ткани полотняного переплетения. В XX веке стали вышивать на покупной ткани фабричного производства. Вышивали покупными хлопковыми нитями, либо шерстяными, окрашенными нитями домашнего производства.

Преобладала красно-бело-черная цветовая гамма. На некоторых рушниках встречаются узоры жёлтого, красного, белого и голубого цветов. В орнаментации одежды использовались геометрический и стилизованный растительный орнамент в технике вышивки крестом. Для вышивки предметов быта чаще использовали художественную и счётную гладь.

**II. Практическая часть.**

Вышивка крестом – занятие доступное каждому. Но, как и в любом деле, в нём есть свои маленькие секреты.

*Как начать вышивать крестик*

Крестик обычно вышивают в два этапа. Начинайте вышивку слева направо. Сделайте прокол в нижнем левом углу первого квадратика на ткани Аида и диагональный стежок, протянув нитку в верхний правый угол квадрата. Сделайте прокол в нижнем левом углу второго квадратика и выполните в нём такую же диагональ. Повторите действия, чтобы закончить ряд.

*Как закончить крестик*

Чтобы закончить крестик, прошейте ряд в обратном направлении – справа налево. Сделайте прокол в нижнем правом углу последнего квадратика. Сделайте диагональ, протянув нить в верхний левый угол, чтобы получился крестик. Повторите действия, чтобы закончить вышивать ряд. Если вы вышиваете на льне с равномерным переплетением нитей, делайте стежок через две нити ткани.

Последовательность вышивки:

1. На схеме карандашом отметьте центр и начинайте вышивать с этой точки. Возможно, вам придётся отсчитать несколько квадратиков от центра, чтобы начать вышивать ряд в соответствующем месте.

2. Сделайте прокол иглой, вытяните нитку на лицевую сторону ткани и начните вышивать первые диагонали крестиков, двигаясь слева направо. Сделайте узелок с изнаночной стороны ткани, протянув нитку под первыми стежками (стежки с изнаночной стороны должны быть вертикальными).

3. Когда вы закончите вышивать рисунок крестиком, отрежьте все незакрепленные концы ниток с изнаночной стороны ткани. Положите вышивку лицевой стороной на мягкое белое полотенце, накройте чистым

куском ткани и слегка прогладьте утюгом. В этом случае стежки не станут плоскими.

4. Если вам понадобится постирать ткань с вышивкой, делайте это в теплой воде с моющим средством, подходящим для деликатных тканей. Стирать очень осторожно. Их нельзя замачивать, заливать кипятком и кипятить. Несколько раз опустите ткань в мыльную воду и так же осторожно прополощите её несколько раз. Заверните ткань в полотенце, чтобы избавиться от лишней влаги, затем положите на ровную поверхность и дайте высохнуть. Утюжат изделие во влажном состоянии с изнаночной стороны на мягкой чистой ткани. Отутюженное изделие держат в развёрнутом виде до тех пор, пока оно не остынет.

Участникам мастер-класса предлагается на выбор вышить любую птичку по схемам.







**III. Заключительная часть. Рефлексия.**

Понравился ли вам мастер-класс? Есть ли желание продолжить работу? Желаю Вам новых творческих побед!

# Выстава дзіцячай творчасці ”Птушкі роднага краю“



”Салавей“ Кузняцоў Кірыл



”Шчыгол“ Сярко Анастасія



”Птушкі на кармушцы“
Калектыўная работа



”Снягір“ Пушнякова Арына



”Бусел“ Пушнякова Эліка



”Птушка на кармушцы“
Калектыўная работа



”Дружная сям’я“ Чэкліна Карына



”Чароўныя птушкі“ Кучмарова Аліна



”Пяшчота“ Навіцкая Кацярына



”Буслы“ Багданава Алёна



”Родная зямля“
Галуза Сафія



”Сава“
Мацюшчанка Анастасія



”Глушэц“ Радзівоненкаў Канстанцін



”Глушэц“
Мацюшкоў Павел



”Размова“
Сімановіч Захар



”Асалода“
Стоцік Яна



”Асалода“
Краўцова Лізавета



”Першае падарожжа“
Смолікава Алёна

# Выстава малюнкаў ”Птушыны вырай“



”Смачна есці“ Праліч Ганна



”Снегіры“
Арлоў Антон



”Сям’я“ Лашкоў Глеб



”Гаспадар“
Ушал Богдан



”Чапля“
Гарлачова Рыта



”Чарля“
Бурлакоў Марк

*Конкурс чытальнікаў ”Птушкі нашы сябры“*
*Байкова Дар’я*




## Акцыя ”Дом для птушак“





## Літаратура


1. Адамовіч, Я.К. Рана на Івана / Я.К. Адамовіч. – Мн. : Беларуская навука, 2000. – 215 с., іл.
2. Анталогія беларускай народнай прыказкі, прымаўкі і выслоўя / Уклад., аўт прадмовы А.С. Фядосік. – Мн. : Ураджай, 2002. – 298 с. : іл.
3. Беларускі дзіцячы фальклор. Традыцыйныя запісы, апрацоўкі і аўтарскія творы. – Мн. : Беларусь. – 272 с.
4. Беларускі народны каляндар / Аўт. Уклад. А.Ю. Лозка; Маст. А.І. Дашкевіч. – Мн. : Полымя, 1992. – 205 с. : іл.
5. Беларускія народныя абрады / Склад., навук. Рэд. і прадм. Л.П. Касцюкавец. – Мн. : Беларусь, 1994. – 128 с.
6. Веснавыя святы: Дапам. Для настаўнікаў і выхавальнікаў / Аўт. – уклад. А.М. Аляхновіч, А.Ю.Лозка; Маст. У.І. Сытчанка. – Мн. : Беларусь, 2000 – 158 с. : іл. – (Бібліятэчка народных святаў і прысвяткаў).
7. Вількін, Я.Р. Беларускія народныя гульні / Я.Р. Вількін. Маст. В. Пачкаева. – Мн. : Беларусь, 1996. – 86 с. : іл.
8. Доманская, А.И. / Дажынкі па - беларускі: ад рытуалу да карнавалу. – 2013.
9. Зборнік беларускага фальклору : з гук. электрон. дадаткам. – Мінск : Выш. Шк., 2010. – 254 с.
10. Зімовыя святы: Дапам. Для настаўнікаў і выхавальнікаў / Аўт. – уклад. А.М. Аляхновіч, А.Ю.Лозка; Маст. М.У. Анемпадыстаў. – Мн. : Беларусь, 1999 – 159 с. : іл. – (Бібліятэчка народных святаў і прысвяткаў).
11. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад., класіф., сістэм матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага; Уступ арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса; Рэдкал. : А.С. Фядосік (гал рэд.) і інш. – Мн. : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с. – (БНТ : Беларус. Нар творчасць / Ан БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
12. Касцюкавец, Л.П. Беларускія народныя абрады / Л.П. Касцюкавец. – Минск : Беларусь, 1994.
13. Коваль, У.І., Новак, В.С. Беларускія народныя святы і звычаі / У.І. Коваль, В.С. Новак. – Гомель : Беларускае Агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі.
14. Котович, О. Золотые правила народной культуры / Оксана Котоаич, Янка Круг. – 11-е изд. Минск : Адукацыя и выхаванне, 2016. – 592 с. : ил.
15. Краж, У.М., Трубчык В.В. Беларускія народныя гульні / У.М. Краж, В.В. Трубчык. – Друкарня ”Перамога“Міністэрстап інфармацыі Рэспублікі Беларусь. – 1993.
16. Кухаронак, Т. І. Радзіныя звычаі і абрады беларусаў / Т.І. Кухаронак. –Мінск : Навука і тэхніка, 1993.

17. Крынічка народнай творчасці : зборнік фальклорных твораў : для дзяцей мал. Шк. Узросту / склад. : А.У. Івановіч, А.А. Сабіч. – Мінск : Беларусь, 2013. – 222 с. – (Школьная бібліятэка).
18. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў / В.Д. Ліцьвінка. – Мн. : Беларусь, 1997. – 176 с : іл.
19. Лозка, А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні: Дапам. Для настаўнікаў, выхавальнікаў, кіраўнікоў гурткоў / А. Лозка. – Мн. : Тэхналогія, 1997. – 183 с.
20. Соколова, В.К./ Веснавое - летнія каляндарныя абрады рускіх, украінцаў і беларусаў / В.К. Соколова. - 1979.
21. Фядосік, А.С., Пятроўская, Г.А. Народная спадчына [Для сярэд. І ст. шк. узросту] / А.С. Фядосік, Г.А. Пятроўская. – Мн. : Нар. Асвета, 1984. – 208 с., іл.